Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 106 (6383) | 11 мая 1939 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

Социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Усебеларускі з'езд упаўнаважаных лясной промкааперацыі.

Па Совецкай краіне.

Тзарэтычная канферэнцыя па кнізе В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць социял-дэмакратаў?»

Пастанова Галоўнага камітэта Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі аб зацвярджэнні ўдзельнікаў Выстаўкі.

К. Хомчанка — За права ўдзелу ў Выстаўцы.

А. Г. Злотнік — Узмацніць ахову социялістычнай уласнасці.

АРТЫКУЛЫ:

А. Глозман — Шырэй дарогу большэвіцкім наватарам тэхнікі.

М. А. Керзін, Л. М. Лейтман — Аб мастацкай асвеце ў БССР.

Экспедыцыі Акадэміі навук БССР.

Прэміраванне лепшых насценгазет ВНУ.

Генеральны праект планіроўкі Барысава.

ЗА РУБЯЖОМ:

Антыпольская кампанія германскага друку.

Канцэнтрацыя германскіх штурмавікоў у Данцыгу.

Заява польскага ўрада па пытанню аб Данцыгу.

Германскія патрабаванні Літве.

Хваляванні ў Клайпедскай вобласці.

Спрэчкі ў палаце абшчын.

Ваенны парад у Рыме.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ ОРГАНАЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

Перамога социялізма ў нашай краіне, паспяховае ажыццяўленне двух сталінскіх пяцігодак забяспечылі бурны рост усіх галін народнай гаспадаркі і культуры. Вялікія поспехі атрыманы і ў галіне аховы здароўя.

Ахове здароўя насельніцтва — арганізацыі бясплатнай медыцынскай дапамогі, стварэнню добра абсталяванай сеткі лячэбна-прафілактычных устаноў—наша партыя і ўрад заўсёды аддавалі і аддаюць выключна вялікую ўвагу. На лячэнне грамадзян, на санітарнае аздараўленне гарадоў і вёсак, ахову здароўя мацярэй і дзяцей штогод адпускаюцца велізарныя сродкі.

За годы совецкай улады і асабліва за перыяд двух сталінскіх пяцігодак у нашай краіне, у тым ліку ў БССР, дасягнут сапраўдны росквіт медыцыны. Вырас выдатны клінічны гарадок у Менску, новыя бальніцы, клінікі, амбулаторыі, дыспансеры ў гарадах і раёнах рэспублікі. Медыцынскі інстытут, медшколы штогод выпускаюць новыя атрады совецкіх урачоў і сярэдняга медперсанала.

Да рэволюцыі на тэрыторыі сучаснай Беларусі было ўсяго 2410 бальнічных ложкаў, а зараз колькасць бальнічных ложкаў складае 16 тысяч.

Створана шырокая сетка ўстаноў аховы маці і дзіцяці, якіх да рэволюцыі зусім не было. Зараз у БССР існуе 144 кансультацыі для жанчын і дзяцей, 11 дамоў маці і дзіцяці на 900 ложкаў, 295 пастаянных дзіцячых ясляў і т. д.

Да непазнавальнасці змянілася тэхнічная ўзброенасць лячэбных устаноў. Яны зараз у большасці маюць свае лабараторыі, рэнтгенаўскія кабінеты, фізіятэрапеўтычныя ўстаноўкі.

З года ў год растуць дзяржаўныя асігнаванні на ахову здароўя. У 1924 г. яны складалі 3.500 тысяч рублёў, у 1932 г. — 45.417 тысяч рублёў, у 1938 г. — 247.438 тысяч рублёў, а на 1939 г. на ахову здароўя адпушчана 288 мільёнаў рублёў.

Не гледзячы на вялікія поспехі, мы маем яшчэ рад істотных недахопаў.

Партыя і ўрад патрабуюць рашучага паляпшэння якасці лячэбнай дапамогі на сяле, умацавання сельскіх медыцынскіх участкаў.

Як вядома, у пастанове СНК сярод раду іншых мерапрыемстваў вызначалася ўмацаванне сельскіх участкаў урачамі з гарадоў. Сотні ўрачоў ахвотна адгукнуліся на прапанову ўрада і самааддана працуюць ў вёсцах, законна лічачы гэта для сябе пачэснай справай.

Але да гэтага часу з існуючых у Беларусі 455 сельскіх урачэбных участкаў 170 не маюць яшчэ ўрачоў. Гэта ў той час, калі толькі адзін Менскі медінстытут выпусціў за апошнія 15 год каля 3.000 урачоў. Ёсць нямала фактаў, калі ўрачы, якія толькі што скончылі медінстытуты і, паводле закона, абавязаны 5 гоі працаваць на перыферыі, асядаюць у гарадах, а Наркамат аховы здароўя мірыцца з такім ненармальным становішчам.

У сельскіх урачэбных участках і фельчарска-акушорскіх пунктах нехапае таксама каля 500 чалавек сярэдняга медперсанала. Надзвычай марудна ідзе выкананне плана адкрыцця фельчарскіх і акушорскіх пунктаў: замест 1.100 працуюць толькі 865.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што Наркамат аховы здароўя і яго органы на месцах яшчэ не ўзяліся як след за наладжванне медыцынскай дапамогі на вёсцы. Задача заключаецца ў тым, каб у найкарацейшы тэрмін укамплектаваць сельскія ўрачэбныя ўчасткі лепшымі медыцынскімі кадрамі, паскорыць адкрыццё вызначаных планам фельчарскіх і акушорскіх пунктаў і абсталяваць іх патрэбнай апаратурай.

Вялікую ролю ў паляпшэнні медпапамогі на вёсцы адыгрывае шэфства гарадскіх урачэбных калектываў над сельскімі. У гарадскіх калектывах ёсць многа высококваліфікаваных урачоў, дацэнтаў, прафесараў і арганізацыя іх дапамогі сельскім участкам неапаніма. Трэба адзначыць станоўчы вопыт шэфскай работы калектыва Другога клінічнага гарадка (Менск). Вось ужо больш года, як гэты калектыў урачоў шэфствуе над сельскімі ўрачэбнымі ўчасткамі Асіпавіцкага раёна. Прафесары тт. Мангейм, Трусевіч, дацэнты Алукер, Сегаль, Лашідус, Голуб і лепшыя ўрачы Клінічнага гарадка сістэматычна выязджаюць у падшэфны раён і аказваюць практычную дапамогу мясцовым урачам. Шэфамі абследаваны ўсе сельскія ўчасткі, абсталявана аперацыйнае аддзяленне, падрыхтавана спецыяльная медыцынская сястра для гэтага аддзялення, прачытан рад навуковых дакладаў і т. д.

А хіба-ж такую работу не могуць арганізаваць у вёсцы калектывы ўрачоў Гомеля, Віцебска, Магілева, Слуцка, Мазыра, Бабруйска, Оршы, Барысава? Бясспрэчна, могуць і павінны. Наркамат, гарадскія аддзелы аховы здароўя, прафсаюзныя арганізацыі абавязаны максімальна садзейнічаць развіццю шэфскай справы і арганізацыі пастаяннай дапамогі вёсцы.

Вялікія задачы стаяць перад органамі аховы здароўя ў галіне новага будаўніцтва. Выкрытыя ворагі народа ўсімі мерамі імкнуліся зрываць будаўніцтва новых лячэбных устаноў, пагаршаць якасць медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Ліквідацыя-ж вынікаў шкодніцтва ідзе вельмі марудна. Даволі сказаць, што мінулагодні план будаўніцтва новых бальніц у гарадах выкананы толькі на 41 проц., у сельскіх мясцовасцях—на 60 проц., план будаўніцтва радзільных дамоў—на 55 проц. і ясляў—на 64 проц. Не выкананы план капітальнага будаўніцтва і ў першым квартале 1939 года. З адпушчаных на квартал 3.200 тысяч рублёў скарыстана толькі 1.900 тысяч рублёў. Асабліва дрэнна ідзе асваенне сродкаў у Палескай і Гомельскай абласцях.

Такое ганебнае становішча з'яўляецца рэзультатам таго, што Наркамат аховы здароўя БССР і яго органы на месцах не ажыццяўляюць належнага кіраўніцтва і кантролю за будаўніцтвам, а гарадскія і раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі не аказваюць ім дзейснай дапамогі.

Змагаючыся за своечасовае выкананне планаў будаўніцтва, органы аховы здароўя павінны адначасова ўзняць якасць работы існуючых медыцынскіх устаноў.

Выключна вялікія клопаты праяўляюць партыя і ўрад аб ахове маці і дзіцяці. У бягучым годзе толькі па лініі Наркамата аховы здароўя БССР на летнія аздараўліцельныя мерапрыемствы дзяцей асігнавана 2.340 тысяч рублёў. Сезонных ясляў у калгасах павінна быць адкрыта на 200 тысяч дзяцей. Велізарныя сродкі адпушчаны на будаўніцтва ясляў, радзільных дамоў, малочных кухань і інш. Новае-ж будаўніцтва пакуль-што ідзе вельмі марудна. Сродкі не асвоены.

Выключна адказныя задачы органаў аховы здароўя. Трэба ў найкарацейшы тэрмін падцягнуць адстаючыя ўчасткі і забяспечыць узорную работу лекавых устаноў. Кроўная справа горсоветаў, райвыканкомаў — дапамагчы органам аховы здароўя ў іх адказнейшай рабоце.

Совецкі народ пераможна будуе комуністычнае грамадства. Задача заключаецца ў тым, каб якасць работы органаў аховы здароўя ўзняць на ўзровень патрабаванняў будаўнікоў комунізма.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА імені ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

ШЫРОКА РАСПАЎСЮДЗІЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВІКОЎ

На сплаўных участках, фарміровачных пунктах Прыпяцкага воднага басейна наступіла гарачая пара. З выплавачных рачак лес пачаў паступаць на шырокую многаводную Прыпяць. Сплаўшчыкі даражаць кожным днём. Быстрае абмяленне мелкіх рэк з'яўляецца сур'ёзнай пагрозай для паспяховага правядзення сплава.

На 10 мая па Мазырскай канторы пушчана ў сплаў 207,9 тысячы кубаметраў драўніны (календарны план 195 тысяч). Прыплаўлена 82,4 тысячы кубаметраў замест 100 па заданню. Асабліва адстае Скараднянскі ўчастак (начальнік Дудко), які выканаў сваё красавіцкае задание на 25 проц. З-за дрэннай арганізацыі працы, няправільнай расстаноўкі людзей гэты ўчастак апынуўся ў глыбокім прарыве.

На некаторых сплаўных участках (Нароўля, Лельчыцы) асобныя брыгады — Дзімядзенкі, Лісіцкага—паказваюць выдатныя ўзоры работы, выконваючы свае нормы выпрацоўкі на 200—250 проц., але аб іх мала хто ведае, вопыт гэтых лепшых людзей не папулярызуецца сярод усёй масы сплаўшчыкаў.

Дрэнна арганізавана снабжэнне сплаўшчыкаў. У магазінах Жыткавіцкага райсаюза нехапае самых неабходных прадметаў. Апрача хлеба тут нічога не знойдзеш. У большасці прадукты для рабочых прыходзіцца завозіць за 300 кілометраў—са Старобіна, Чырвонай Слабады і інш.

Трэба адзначыць, што профсаюзныя арганізацыі да гэтага часу яшчэ не раскачаліся, на многіх участках не праводзяць ніякай культурна-масавай работы.

ВЫСОКАЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ КАЛГАСНІКАЎ НА СПЛАВЕ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Горача адгукнуліся калгаснікі Гомельскай і Магілеўскай абласцей на заклік правадыра народаў таварыша Сталіна аб выдзяленні лепшых калгаснікаў для работы ў социялістычнай прамысловасці. На сплаўныя ўчасткі і прыстані Гомельскай канторы прыбылі сотні кваліфікаваных сплаўшчыкаў.

Сплаўшчыкі сельгасарцелі імені Варашылава, Касцюковіцкага раёна, якія паказалі ўзоры высока прадукцыйнай работы на калгасных палях, з першых-жа дзён работы на сплаве таксама адзначаюцца сваёй дысцыплінаванасцю і стаханаўскай работай. Брыгада тав. Казакова Васілія, з гэтага-ж калгаса, у колькасці 13 чалавек сплавіла на 10 дзён раней тэрміна 700 кубаметраў драўніны для новабеліцкай запалкавай фабрыкі «Везувій». За паспяховую работу брыгада атрымала прэмію-надбаўку, апрача свайго асноўнага заработку, 2.369 руб. Дзённы заработак кожнага сплаўшчыка складае 36 руб.

Выдатных паказальнікаў дабілася брыгада сплаўшчыкаў—калгасніка тав. Валчкова Фёдара. Усе члены брыгады заключылі паміж сабой социялістычны дагавор і абавязаліся значна скараціць тэрмін сплава. Брыгада сваё слова стрымлівае. Пры цяжкіх метэаралагічных умовах яна сплавіла па рацэ Бесядзь 598 кубаметраў лесу за 10 дзён замест 20.

Асобныя сплаўшчыкі гэтай брыгады: тт. Сяўрук Філіп, Валчок Іван, Гарэлік Майсей і іншыя выконваюць свае нормы на 200 проц.

Калгаснікі-сплаўшчыкі Свяцілавіцкага раёна брыгады тав. Сальнікава на 6 дзён раней тэрміна сплавілі 1500 кубаметраў лесу.

Вярталочыся з чарговых рэйсаў на прыстані, стаханаўцы бяруць новыя абавязацельствы—змагацца з яшчэ большай энергіяй за датэрміновае выкананне сплаўных работ.

Н. ГІРШЫН.

ПАРАВОЗНАЯ БРЫГАДА ШЧАДРОВЫХ

ВІЦЕБСК, 10 мая. (БЕЛТА). На заклік знатнай чыгуначніцы краіны Зінаіды Троіцкай горача адгукнуліся сотні жонак, сясцёр і дачок работнікаў чыгунак.

Аляксандра Васільеўна Шчадрова — жонка машыніста Віцебскага вузла, была адной з тых, якія пажадалі стаць памочнікамі машыністаў. У кастрычніку мінулага года Аляксандра Васільеўна ў ліку 26 патрыётак паступіла на курсы памочнікаў машыністаў пры Віцебскім паравозным дэпо.

Вялікае жаданне і настойлівая вучоба дапамаглі ёй у кароткі тэрмін асвоіць тэхніку лакамацтва. У Міжнародны комуністычны жаночы дзень — 8 сакавіка гэтага года тав. Шчадрова, скончыўшы на выдатна курсы, атрымала права памочніка машыніста. З сакавіка Аляксандра Васільеўна разам са сваім мужам — машыністам Аляксандрам Нікіфаравічам Шчадровым працуюць на паравозе № 4639, які па праву лічыцца лепшым манеўровым паравозам дэпо.

Уключыўшыся ў социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, брыгада Шчадровых узяла абавязацельства давесці міжпрамывачны прабег паравоза да 60 сутак замест нормы 24. Сваё абавязацельства Шчадровы з чэсцю выканалі.

Працуючы на адным з труднейшых участкоў, паравозная брыгада дае добрыя колькасныя паказальнікі, фарміруючы па 8—10 паяздоў пры заданні 7.

Загадам начальніка паравознай службы Захоўняй чыгункі брыгадзе аб'яўлена падзяка.

Аляксандра Васільеўна заяўляе:

— Я не думаю спыніцца на дасягнутым. Мы, маладыя памочнікі машыністаў, павінны няспынна павышаць сваю кваліфікацыю, каб у патрэбны момант быць гатовымі стаць на месца сваіх мужоў — машыністаў.

Аляксандра Міхайлаўна Былінская — настаўніца Марціна-Горскай няпоўнай сярэдняй школы (Пухавіцкі раён, Менская вобласць), узнагароджаная ў ліку асоба вызначыўшыхся настаўнікаў сельскіх школ ордэнам «Знак почета».

Фото І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

НА КАРЫСЦЬ РАДЗІМЫ

Вялікая і пачэсная ўзнагарода мяне ордэнам Леніна ўзмацніла ва ўсёй маёй істоце пачуццё велізарнейшай адданасці дарагой радзіме, нашай партыі, вялікаму і роднаму Сталіну.

Гэтая ўзнагарода выклікала ў мяне надзвычайную бадзёрасць, прынесла мне такое шчасце, такую радасць, якіх я не меў на працягу ўсяго майго 63-гадовага жыцця. Даю клятву ўвесь астатак свайго жыцця прысвяціць справе выхавання нашай шчаслівай дзетвары ў духу комунізма, у духу адданасці нашай партыі, социялістычнай радзіме.

Я абавязваюся дзяліцца сваім многагадовым педагагічным вопытам з малодшымі таварышамі-настаўнікамі, каб яны маглі з гордасцю насіць пачэснае імя настаўніка совецкай школы. У выпадку патрэбы, са зброяй у руках стану грудзьмі супроць ворагаў і не пашкадую свайго жыцця на абарону дарагой радзімы.

А. Я. ДАРАШЭВІЧ,

загадчык навучальнай часткай Горвальскай сярэдняй школы, Рэчыцкага раёна, Гомельскай вобласці.

УСЕ СІЛЫ—КОМУНІСТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ ДЗЯЦЕЙ

Вестка аб узнагароджанні мяне ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга выклікае новы прыліў сіл і энергіі. Узнагарода натхняе на яшчэ лепшую ўпорную работу па комуністычнаму выхаванню нашых шчаслівых і радасных дзяцей.

Школе я аддаў 10 гоі работы. Праца настаўніка стала маёй штодзённай неабходнасцю. За 10 год я многага дасягнуў у сваёй рабоце. Вось у гэтым годзе па сваіх дысцыплінах маю стопроцантную паспяховасць. У перадавыя выходзіць і ўся наша школа. За трэцюю чверць мы мелі 95 проц. паспяховасці. Яшчэ лепшых паказальнікаў дасягнем у далейшым.

Днямі мяне прынялі кандыдатам у члены партыі Леніна—Сталіна. Гэта абавязвае працаваць яшчэ больш, яшчэ лепш, каб апраўдаць высокую ўзнагароду — званне партыйнага большэвіка. Аддам усе свае сілы і веды на выхаванне нашага маладога пакалення — актыўных будаўнікоў комуністычнага грамадства.

П. Е. ЖЭУНЕРАЎ,

дырэктар Боравіцкай НСШ, Кіраўскага раёна, Магілеўскай вобласці.

УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД УПАЎНАВАЖАНЫХ ЛЯСНОЙ ПРОМКААПЕРАЦЫІ

Учора ў менскім клубе імені Сталіна пачаў сваю работу другі з'езд упаўнаважаных лясной прамысловай кааперацыі Беларусі. У парадку дня з'езда — справаздачныя даклады Усекалеспромсаюза і Белкалеспромсаюза, выбары дэлегатаў на ўсесаюзны з'езд работнікаў лясной промкааперацыі і інш.

Пад хоўга не змаўкаючыя апладысменты з'езд выбраў ў пачотны прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з любімым правадыром сусветнага пролетарыята вялікім Сталіным, а таксама тт. Дзімітрава, Хозе Дыяса і Эрнста Тэльмана.

На вячэрнім пасяджэнні быў заслухан справаздачны даклад намесніка старшыні Прэзідыума Усекалеспромсаюза (Масква) тав. Турбенкова. Дакладчык расказаў аб поспехах, дасягнутых лясной промкааперацыяй саюза, і аб вялікім палітычным і вытворчым уздыме ў арцелях сістэмы, выкліканым разгарнуўшымся социялістычным спаборніцтвам імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Лесапрамысловая кааперацыя БССР за годы двух сталінскіх пяцігодак дабілася значных поспехаў. У параўнанні з 1932 годам выпуск прадукцыі павялічыўся ў тры разы. Лік членаў арцеляў за апошнія 5 год павялічыўся амаль у два разы і складае зараз 15.879 чалавек.

Шырока разгарнулася ў арцелях социялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Перадавыя прадпрыемствы БССР, як напрыклад бабруйская арцель «Чырвоны мэбельшчык», бобрская—«Ударнік» і рад іншых сталі суцэльна стаханаўскімі. У арцелях сістэмы налічваецца зараз 4.741 стаханавец — рост у параўнанні з 1936 годам у пяць разоў. Лепшыя стаханаўцы арцелі рэзка ўзнялі прадукцыйнасць працы. Стаханаўцы тт. Кравчоўскі (Копыская арцель), Левін (аршанская арцель), Канапелька (віцебская арцель) выконваюць свае заданні на 200—350 проц. 4-месячнае вытворчае задание лясная промкааперацыя Беларусі выканала на 112 проц. Выпушчана дадаткова на 5 мільёнаў рублёў прадукцыі.

Сёння з'езд прадаўжае сваю работу.

Пленум ЦК профсаюза запалкавай і фанернай прамысловасці

10 мая ў зале пасяджэнняў Дома профсаюзаў БССР пачаў сваю работу IV пленум ЦК профсаюза запалкавай і фанернай прамысловасці.

Прысутнічае 60 чалавек — члены пленума і госці. Сярод прысутнічаючых—знатныя людзі: дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Е. С. Журанкова, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР А. М. Бахта і інш.

З дакладам аб рабоце профарганізацый у сувязі з рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б) выступіў старшыня ЦК саюза тав. Пілі-пенак.

Заўтра—прадаўжэнне работы пленума.

ХРОНІКА

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР назначыў тав. Уманскага К. А. паўнамоцным прадстаўніком СССР у Злучаных Штатах Амерыкі. (ТАСС).

На Совецкай краіне

ПОМНІК В. І. ЛЕНІНУ ВА УЛЬЯНАЎСКУ

Ва Ульянаўску ў гэтым годзе намечана пачаць пабудову помніка В. І. Леніну. Праект помніка распрацаван вядомым скульптарам заслужаным дзеячам мастацтваў М. Г. Манізерам.

98 НОВЫХ ШКОЛ

У гарадах Украіны разгарнулася будаўніцтва школьных будынкаў. Многія з іх будуюцца скарасным спосабам. К пачатку 1939—1940 года дзеці атрымаюць 98 новых школ.

КУРОРТНЫ СЕЗОН У ПРЫМОР'І

ВЛАДЗІВАСТОК, 9 мая. (ТАСС). У Прымор'і пачаўся летні курортны сезон. У адрамантаваныя санаторыі прыбылі сотні працоўных.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца курорт «19-й километр», размешчаны на беразе Амурскага заліва. Вылатны пляж прыцягвае сюды па выходных днях многа адпачываючых з горада. На курорце рэканструіраваны грязелячэбніца, электралячэбны камбінат. Днямі сюды прыехалі 150 адпачываючых. За сезон тут пабывае каля 1500 чалавек.

Працуюць таксама грязевы курорт «Сад-город», Усурыйскія мінеральныя воды («Шмаковка») і інш. У гэтым годзе на курортах краявога аддзела аховы здароўя будуць лячыцца больш 5.500 чалавек.



Новы тралейбусны маршрут у Ленінградзе. 27 красавіка ў Ленінградзе адкрыўся новы тралейбусны маршрут: Фінляндскі вакзал—плошча Стачак. Гэты маршрут звязвае два буйнейшыя прамысловыя раёны горада. НА ЗДЫМКУ: тралейбус на плошчы Стачак.

Фото Р. Мазелева. (Фотахроніка ТАСС).

ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ВЫНІКАМ XVIII З'ЕЗДА ВКП(б)

ЛЕНІНГРАД. (ТАСС). У Дзяржаўным музеі рэволюцыі адкрылася выстаўка, прысвечаная вынікам XVIII з'езда ВКП(б). Выстаўка размешчана ў шасці залах Палаца мастацтваў (былы Зімні палац).

У макетах, карцінах, фатаграфіях і дакументах паказаны велізарныя змяненні, якія адбыліся ў краіне ў перыяд ад XVII да XVIII з'езда большэвіцкай партыі. Матэрыялы выстаўкі ярка ілюструюць развіццё народнай гаспадаркі за годы другой пяцігодкі, рост дабрабыту працоўных.

Электрыфікаваныя карты расказваюць аб прадпрыемствах, уступіўшых у строй у першыя дзве пяцігодкі, і асноўных новабудоўлях трэцяй пяцігодкі.

Звяртаюць на сябе ўвагу наведвальнікаў па-мастацку вышытыя на бархаце гербы адзінаццаці саюзных рэспублік і макет велічнай пабудовы Сталінскай эпохі — Палаца Совецтаў.

Выстаўка карыстаецца вялікім поспехам у ленінградцаў. За першыя тры дні яе наведала больш 20 тысяч чалавек.

ДАВЕДАЧНАЯ КАРТА СССР

ЛЕНІНГРАД. (ТАСС). Ленінградская картаграфічная фабрыка № 1 прыступіла да друкавання падрабязнай даведачнай карты СССР. Яна будзе выдана на 33 лістах у выглядзе альбома размерам 60 х 70 см. Карта такога размеру выпускаецца ўпершыню. Яе тыраж—25 тысяч экземпляраў.

У сочынскі санаторый «Правда» пасля заканчэння зімовага рамонту прыбылі першыя адпачываючыя. НА ЗДЫМКУ: выгляд санаторыя «Правда» в праспекта імені Сталіна.

Фото С. Лейтман (Фотахроніка ТАСС).

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЗБОРНІК «ЗЕМЛЯ РОДНАЯ»

Выдавецтва «Искусство» выпускае к адкрыццю Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі вялікі літаратурна-мастацкі зборнік «Земля родная», прысвечаны калгаснаму сялянству.

ВУЗКАПЛЁНАЧНЫЯ КІНОПЕРАСОЎКІ НОВАЙ МАРКІ

Ленінградскі завод «Кінап» пачаў выраблянь вузкаплёначныя кінаперасоўкі новай маркі «ПУ-14». Яны аснашчоны лямпамі і громкагаварыцелямі высокай якасці і разлічаны на абслугоўванне аўдыторыі ў 600 чалавек.

УРУЧЭННЕ ШЭЎЧЭНКАЎСКІХ МЕДАЛЕЙ

КІЕЎ, 9 мая. (ТАСС). Сёння ўрадавы Шэўчэнкаўскі камітет УССР уручыў раду паэтаў, пісьменнікаў і мастакоў Совецкага Саюза, прымаўшых актыўны ўдзел у святкаванні 125-годдзя з дня нараджэння Т. Г Шэўчэнка, юбілейныя бронзавыя медалі.

На ліцавым баку медалі выгравіраван барэльеф паэта з надпісам: «Тарас Григорьевич Шевченко». Пад барэльефам — даты нараджэння і смерці паэта: 1814—1861 гг. На адваротным баку медалі—лаўровы вянок, зорка з разыходзячымісяся прамянямі, даты 1814 — 1939 і рымскія цыфры CXXV.



Па гарадах Совецкага Саюза. Праспект імені Кірава і вуліца 8-га студзеня ў г. Баку.

Фото Ф. Шэйцова (Фотахроніка ТАСС).

ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА КНІЗЕ В. І. ЛЕНІНА
„ШТО ТАКОЕ „ПРЫЯЦЕЛІ НАРОДА“ І ЯК ЯНЫ ВАЮЮЦЬ СУПРОЦЬ СОЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ?“

* * * *

Кіруючыя кадры нашага грамадства—совецкая інтэлігенцыя — паспяхова авалодваюць бяссмертным вучэннем большэвіцкай партыі, тэорыяй марксізма-ленінізма. Выдатнае сталінскае апавяданне аб гераічным шляху барацьбы большэвікоў, энцыклапедыя асноўных ведаў у галіне марксісцка-ленінскай тэорыі—«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»—становіцца сапраўды незамянімым спадарожнікам кожнага актыўнага і свядомага будаўніка комунізма.

130 чалавек—прафесараў, урачоў, дацэнтаў, асістэнтаў Першага менскага клінічнага гарадка з вялікай цікавасцю самастойна вывучаюць навуку ўсіх навук—марксізм-ленінізм. 30 чалавек займаюцца ў гуртках.

Днямі па ініцыятыве перадавой часткі інтэлігенцыі Клінгарадка пад кіраўніцтвам бюро партарганізацыі была праведзена тэарэтычная канферэнцыя па кнізе В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?». Два месяцы ўпорна рыхтавалася інтэлігенцыя да гэтай канферэнцыі.

65 чалавек, прысутнічаўшых на гэтай канферэнцыі, з вялікай цікавасцю і глыбінёй вывучалі выдатны твор В. І. Леніна.

Ніжэй мы змяшчаем скарочаны даклад тав. Дазорцавай аб тэарэтычным значэнні кнігі Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?», выступленне па дакладу, а таксама ўражанні аб праведзенай тэарэтычнай канферэнцыі.

* * *

Дацэнт гінекалагічна-акушорскай клінікі тав. Г. Л. Дазорцава выступае з дакладам — «Тэарэтычнае значэнне кнігі В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?». Фото І. Другуля.

З ДАКЛАДА ДАЦЭНТА Г. Л. ДАЗОРЦАВАЙ

Кніга «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?» з'яўляецца першай буйнай работай В. І. Леніна. Яна была напісана ў 1894 г. (Леніну тады было толькі 24 годы) і ў тым-жа годзе нелегальна аддрукавана на гектографе.

Гэтая кніга з'яўляецца адным з найвялікшых дакументаў у гісторыі развіцця нашай партыі.

У сваёй кнізе Ленін падвяргае ўсебаковай сакрушальнай крытыцы народніцкія погляды. Ён сканцэнтроўвае свае ўдары супроць Міхайлоўскага, які лічыўся ў народнікаў «вядомым соцыёлагам», супроць Южакова, які лічыўся іх «эканамістам», і супроць Крывенка, выступаўшага ў народнікаў у ролі іх «палітыка», якія на старонках свайго журнала «Русское богатство» арганізавалі паход супроць рэволюцыйнага марксізма, стараючыся яго ўсяляк абняславіць.

Ленін у гэтай рабоце да канца выкрыў і разбіў ідэйна народнікаў. Ён паказаў сапраўдны твар народнікаў, як фальшывых «прыяцеляў народа», ідучых на справе супроць народа. «...гэтыя паны,—гаварыў Ленін,—з'яўляюцца ад'яўленымі ворагамі соцыял-дэмакратыі». (Творы, т. 1, стар. 55).

У кнізе «Што такое «прыяцелі народа» Ленін поўна і сістэматычна выкладвае погляды рускіх марксістаў супроць народнікаў. Ленін процапаставіў рэакцыйным народніцкім ідэям, якія глядзяць не ўперад, а назад, вялікую праўду марксісцкай тэорыі—тэорыі да канца навуковай, правільна аллюстроўваючай законы грамадскага развіцця, з'яўляючайся ў руках рабочага класа, у руках прапоўных магутнай мабілізуючай, арганізуючай і пераўтвараючай сілай.

Ленін намеціў у сваёй бяссмертнай кнізе асноўныя задачы рускіх марксістаў, заклікаў іх да арганізацыі з разрозненых марксісцкіх гурткоў адзінай партыі пролетарыята.

Ленін з усёй геніяльнасцю ўказаў шлях барацьбы рабочага класа, вызначыў яго ролю як перадавой рэволюцыйнай сілы грамадства, вызначыў ролю сялянства як саюзніка рабочага класа.

Кніга Леніна складалася з трох выпускаў, аднак, другі выпуск да гэтага часу не знойдзен. Аб яго змесце можна судзіць толькі на аснове таго, што мімаходам аб ім гаворыць Ленін у пачатку 3-га выпуска, а таксама на аснове іншых работ («З поваду так званага пытання аб рынках», «Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве» і інш.).

У 1-м выпуску Ленін дае крытыку пярэчанняў народнікаў супроць матэрыялізма і марксізма наогул, адначасова выкладваючы і развіваючы матэрыялістычны светапогляд і дыялектычны метад Маркса.

У 2-м выпуску Ленін разбірае соцыяльна-палітычныя погляды народнікаў, процістаўляючы ім марксісцкае вучэнне.

У 3-м выпуску Ленін крытыкуе тактыку, практычныя прапановы і палітычную праграму народнікаў, высоўваючы станоўчую праграму рэволюцыйнай соцыял-дэмакратыі.

Ва ўсёй сваёй рабоце малады Ленін выяўляе не толькі глыбокае веданне марксізма, але і ўменне творча прымяняць яго да вывучэння тагочаснай расійскай рэчаіснасці. Ён прыцягвае абшырны статыстычны матэрыял, сабраны людзьмі, ніякага дачынення да марксізма не меўшымі, самастойна пераапрацоўвае яго і дае яму марксісцкі аналіз. У канцы сваёй работы ён спісла фармуліруе задачы, стаячыя перад рускімі соцыял-дэмакратамі. Мы знаходзім тут цэлы рад важнейшых палажэнняў, стаўшых потым характэрнай асаблівасцю большэвізма як партыі новага тыпу, характарызуючых ленінізм як новы этап у развіцці марксізма.

Ленін пачынае «Што такое «прыяцелі народа» з абароны і абгрунтавання тэарэтычных асноў марксісцкай партыі—дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма. Ён з незвычайнай яркасцю паказвае, што ў марксісцкай тэорыі няма нічога надуманага, штучнага, ідучага ўразрэз з сапраўдным ходам рэчаў. Ленін прысвячае вельмі яркія старонкі аналізу геніяльнага твора Маркса «Капітал», паказваючы, што «...з часу паяўлення «Капітала» матэрыялістычнае разуменне гісторыі ўжо не гіпотэза, а навукова даказанае палажэнне».

Толькі гістарычны матэрыялізм, які прадстаўляе сабой распаўсюджанне дыялектычнага матэрыялізма на вывучанне грамадскага жыцця, дае навуковае, адзіна правільнае разуменне чалавечай гісторыі, грамадскага развіцця, аб'ясняе пераход ад адных грамадскіх форм да другіх, даказвае гістарычную немінучасць комунізма.

Абараняючы марксісцкую тэорыю і развіваючы яе далей, Ленін ярка характарызуе вялікую сілу гэтай тэорыі: «Непераадолімая захапляючая сіла, якая цягне да гэтай тэорыі соцыялістаў усіх краін, у тым і заключаецца, што яна злучае строгую і вышэйшую навуковасць (з'яўляючыся апошнім словам грамадскай навукі) з рэволюцыйнасцю і злучае не выпадкова, не таму толькі, што аснавальнік дактрыны асабіста з'яднаў ў сабе якасці вучонага і рэволюцыянера, а злучае ў самой тэорыі ўнутрана і неразрыўна». (Творы, т. 1, стар. 218).

З асаблівай сілай пратэстуе Ленін супроць вульгарызацыі марксізма, супроць спроб разглядаць тэорыю марксізма як застыўшую, раз назаўсёды даную гатовую схему. Ленін абараняе творчы марксізм, рухае марксізм уперад, узбагачаючы яго новым вопытам класавай барацьбы пролетарыята.

Разбіваючы погляды народнікаў, адмаўляўшых рэволюцыйную ролю рабочага класа, Ленін з усёй сілай падкрэслівае ролю рабочага класа як адзінага да канца рэволюцыйнага класа. «Чалавек будучага ў Расіі—мужык, думалі прадстаўнікі сялянскага соцыялізма, народнікі ў самым шырокім значэнні слова. Чалавек будучага ў Расіі—рабочы, думаюць соцыял-дэмакраты», пісаў Ленін.

Рабочы клас, вучыць Ленін, з'яўляецца самым перадавым класам у гісторыі чалавечага грамадства, які ў сілу грамадскіх умоў свайго быцця немінуча павінен з'явіцца магільшчыкам капітала. Рабочы клас найбольш рэволюцыйны па самому свайму становішчу ў капіталістычным грамадстве.

Але адначасова з гэтым Ленін у процілегласць «героям» II Інтэрнацыянала ўказвае, што рабочы клас ні ў якім выпадку не павінен замыкацца толькі ў сваіх вузка-класавых рамках. Рускі рабочы, — пісаў Ленін, — адзіны і сапраўдны прадстаўнік усяго прапоўнага і эксплаатуемага насельніцтва Расіі.

Мы бачым тут ідэю гегемоніі пролетарыята, якая з'яўляецца адной з важнейшых асаблівасцей ленінізма.

У той час, як народнікі ігнарыравалі рух мас, адносіліся па-барску, пагардліва да «натоўпа», разглядаючы апошні як бяссэнсную сілу, якая слепа падпарадкоўваецца асобным «героям»,—В. І. Ленін у сваёй рабоце «Што такое «прыяцелі народа» выказваецца аб народзе як аб сапраўдным тварцу гісторыі.

Ён глыбока верыць у здольнасці працоўных нашай вялікай радзімы не толькі руйнаваць старое, але і ствараць выдатнае новае.

Служыць да канца вялікай справе вызвалення народа ад усякіх форм эксплаатацыі, выкрываць ворагаў народа, якімі-б адзеннямі ні прыкрывалі яны сваю здрадніцкую сутнасць, — такі асноўны лозунг, асноўная кіруючая ідэя бяссмертнай ленінскай кнігі.

Ленін ускрывае класавы змест ідэалогіі і палітыкі народнікаў, якія ў 90-х гадах мінулага стагоддзя скаціліся да ганебнай ролі абаронцаў інтарэсаў кулацтва. Праграма народнікаў у вёсцы,—указвае Ленін,—у сілах толькі ўзмацніць і развіць буржуазію.

Народнікі 90-х гадоў адмаўляліся па сутнасці ад усякай рэволюцыйнай барацьбы з царскім самадзяржаўем.

Яны даходзілі да адкрытых заклікаў да прымірэння з царызмам, яны разглядалі царскі ўрад, як пазакласавую сілу, якая ахвотна пойдзе на палепшанне становішча працоўных.

«Прыяцелі народа», — абурана пісаў Ленін, — «ускладаюць свае надзеі адносна вызвалення прапоўнага на «ўрад» і «грамадства», г. эн. органы той самай буржуазіі, якая ўсюды скавала прапоўных. Ленін бязлітасна выкрывае патугі народнікаў скрыць класавыя супярэчнасці, антаганізмы тагочаснай Расіі, спробы «прыяцеляў народа» «прымірыць» эксплаатуемых з эксплаататарамі.

Ленін з велізарнай сілай пераканальнасці, на аснове глыбокага навуковага аналізу грамадскіх умоў дарэволюцыйнай Расіі, паказвае, што толькі бязлітасная класавая барацьба эксплаатуемых супроць эксплаататараў, толькі рэволюцыйны рух мас пад кіраўніцтвам рабочага класа здолен скінуць ненавісны царскі рэжым, здолен знішчыць панаванне эксплаататарскіх класаў.

Ленін паказаў, што сапраўднымі прыяцелямі народа, жадаючымі знішчыць капіталістычны і памешчыцкі гнёт, знішчыць царызм, з'яўляюцца не народнікі, а марксісты.

Сфармуліраваўшы канечную мэту барацьбы рабочага класа, якая накіравана супроць буржуазнага рэжыма і імкнецца да экспрапрыяцыі экспрапрыятараў, да знішчэння тых грамадскіх паралкаў, якія аснаваны на прыгнечанні працоўнага, Ленін падпарадкоўвае гэтай мэце бліжэйшыя задачы барацьбы.

Народнікі, паказвае Ленін, ні ў якім разе не з'яўляліся абаронцамі сялянства, як гэта яны прабавалі прадставіць. Яны закрывалі вочы на становішча беднаты ў вёсцы, на эксплаатацыю беднаты кулацтвам, выступалі па сутнасці справы вырадзіцелямі інтарэсаў кулацтва. Выступаючы супроць гегемоніі пролетарыята, яны асуджалі сялянства на паражэнне.

Яны адгараджвалі рабочы клас ад сялянства і сялянства ад рабочага класа.

Ленін і ў гэтым да канца выкрыў народнікаў.

У адрозненне ад Плеханава, які не ўлічваў, што для пераможнай барацьбы з самадзяржаўем пролетарыят здолее і павінен павесці за сабой сялянства, і зусім скідваў яго з рахунку, — Ленін дае ў данай рабоце адзіна правільнае, марксісцкае вырашэнне пытання аб ролі сялянства ў надыходзячай рэволюцыі, вызначыўшы яго ролю як саюзніка рабочага класа, пры кіруючай ролі рабочага класа ў гэтым саюзе.

Ленін у сваёй кнізе «Што такое «прыяцелі народа», — гаворыцца ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)», — упершыню высунуў ідэю рэволюцыйнага саюза рабочых і сялян, як галоўнага сродка звяржэння царызма, памешчыкаў і буржуазіі».

Гэтая ідэя складае таксама найвялікшую асаблівасць большэвізма. Як паказала гісторыя, сялянства магло дабіцца і сапраўды дабілася знішчэння эксплаатацыі толькі ў саюзе з пролетарыятам і пад яго кіраўніцтвам. Гэтыя ўказанні Леніна мелі велізарнае сусветна-гістарычнае значэнне.

У той час, калі пісалася ленінская работа, частка народнікаў высунула ідэю аб'яднання ўсіх фракцый рэволюцыянераў для заваявання палітычнай свабоды, абходзячы ўсе астатнія, соцыялістычныя і несоцыялістычныя пытанні. Не адмаўляючы магчымасці сумесных баявых выступленняў з падобнай арганізацыяй, калі-б ёй удалося сфарміравацца, Ленін з усёй рашучасцю выступаў супроць якога-б та ні было аб'яднання з імі соцыял-дэмакратаў.

Ён з усёй сілай падкрэслівае неабходнасць арганізацыі соцыялістычнай рабочай партыі. У партыі ён бачыць авангард рабочага класа. Партыя павінна быць узброена рэволюцыйнай тэорыяй. Сама тэорыя ні ў якім разе не з'яўляецца сумай гатовых, застыўшых палажэнняў. Яна павінна быць аснована на дэтальным і падрабязным вывучэнні рускай гісторыі і рэчаіснасці.

Ён заклікае соцыял-дэмакратаў да творчай тэарэтычнай работы, якая павінна будзе накіроўвацца на канкрэтнае вывучэнне ўсіх форм эканамічнага антаганізма ў Расіі, вывучэнне іх сувязі і паслядоўнасці развіцця.

Тэорыя павінна развівацца ў неразрыўнай сувязі з практыкай: «...тэарэтычная і практычная работа зліваюцца разам, у адну работу, якую так метка ахарактарызаваў ветэран германскай соцыял-дэмакратыі Лібкнехт словамі: вывучаць, прапагандыраваць, арганізоўваць».

Ленін сам паказаў узор спалучэння тэарэтычнай і практычнай работы. Ідэі, якія Ленін развіваў у сваёй кнізе «Што такое «прыяцелі народа», ён у той-жа час ажыццяўляў і на практыцы, арганізаваўшы праз некалькі месяцаў пасля выхаду кнігі пецербургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».

Яркія заключныя словы работы, у якой Ленін нарысаваў перспектыву рускага рабочага руху на многа дзесяцігоддзяў уперад, у якой выразна паказаны цяпер ужо пройдзеныя этапы рабочага руху:

«На клас рабочых і зварачаюць соцыял-дэмакраты ўсю сваю ўвагу і ўсю сваю дзейнасць. Калі перадавыя прадстаўнікі яго ўсвояць ідэі навуковага соцыялізма, ідэю аб гістарычнай ролі рускага рабочага, калі гэтыя ідэі атрымаюць шырокае распаўсюджанне і сярод рабочых створацца моцныя арганізацыі, пераўтвараючыя цяперашнюю разрозненую эканамічную вайну рабочых у свядомую класавую барацьбу, — тады рускі **РАБОЧЫ**, падняўшыся на чале ўсіх дэмакратычных элементаў, зваліць абсалютызм і павядзе **РУСКІ ПРОЛЕТАРЫЯТ** (побач з пролетарыятам **УСІХ КРАІН**) прамой дарогай адкрытай палітычнай барацьбы да **ПАБЕДАНОСНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ**» (Творы, т. 1, стар. 194).

Гэтыя выдатныя словы пацверджаны ўсім ходам гісторыі слаўнай большэвіцкай партыі, усім ходам гісторыі трох рэволюцый — буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1905 г., буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў лютым 1917 г. і вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў кастрычніку 1917 г.

Ленін у сваёй геніяльнай працы «Што такое «прыяцелі народа» геніяльна прадбачыў надыходзячую пераможную комуністычную рэволюцыю ў Расіі.

Ідэі, закладзеныя ў кнізе «Што такое «прыяцелі народа», распрацаваныя і развітыя далей Леніным і Сталіным у песнай і неразрыўнай сувязі з рэволюцыйнай барацьбой рабочага класа і працоўных мас сялянства, складаюць магучае, ідэйнае ўзбраенне вялікай партыі Леніна—Сталіна, партыі большэвікоў, прывёўшай прапоўных нашай радзімы да вялікіх перамог соцыялізма.

З выступлення ўрача тав. КІРЗОН

У 60-х гадах пачаў прабуджацца рабочы рух у Расіі. Рабочы клас павёў ужо барацьбу з капіталізмам. Аб гэтым развіцці прамысловага капіталізма ў Расіі, не гледзячы на астаткі прыгонніцтва, сведчаць наступныя факты: колькасць рабочых на адных толькі буйных фабрыках, заводах і чыгунках з 1865 г. да 1890 г. павялічылася з 706 тысяч рабочых да 1.436 тыс. рабочых, г. зн. больш чым у два разы, а к канцу 90-х гадоў яна вырасла да 2.792 тысяч чалавек. Гэта быў ужо сучасны прамысловы пролетарыят.

Развіццё капіталізма ў вёсцы ішло таксама даволі быстра. Пад уплывам гэтага развіцця сялянства расслайвалася: павялічвалася рэзка колькасць сялянскай беднаты, вясковых пролетарыяў і поўпролетарыяў. Колькасць сераднякоў змяншалася і выдзялялася кулацкая вярхушка. На глебе росту рабочага руху і пад уплывам заходне-еўрапейскага рабочага руху пачалі стварацца ў Расіі першыя марксісцкія арганізацыі.

Народніцкія погляды, якія пераважалі тады сярод перадавых рабочых і рэволюцыйна настроенай інтэлігенцыі, з'яўляліся галоўнай ідэйнай перашкодай на шляху распаўсюджання марксізма і соцыял-дэмакратычнага руху. Марксізм у Расіі не мог умацавацца і вырасці, не разграміўшы народніцтва, якое з'яўляецца антымарксісцкай плынню.

Барацьбе з народніцтвам прысвечан рад лепшых работ Леніна. Ленін, перш за ўсё, прыходзіць да высновы, на аснове глыбокага аналізу тэорыі і практыкі, што ў народніцкім соцыялізме роўна нічога соцыялістычнага няма, усе гэтыя тэорыі, безумоўна, не растлумачваюць эксплуатацыі працоўнага і таму, абсалютна, не здольны паслужыць для яго вызвалення, што на самой справе ўсе гэтыя тэорыі аллюстроўваюць і правозяць інтарэсы дробнай буржуазіі.

У артыкуле «Эканамічны змест народніцтва» Ленін дае вызначэнне класавай сутнасці народніцтва. Яшчэ ярчэй і больш рэзка В. І. Ленін у 1912 годзе ў артыкуле «Памяці Герцэна» гаворыць аб рускім народніцтве, што ў ім **няма ні грама соцыялізма**. Такова тая адпраўная, выходная пазіцыя, на якой мы павінны стаяць пры ацэнцы народніцтва. Выходзячы з гэтай пазіцыі, можна даць крытыку праграмных палажэнняў і практыкі народніцтва.

Памятаючы аб дробнабуржуазнай сутнасці народніцтва, разбярэм праграмныя ўстаноўкі і практыку рэволюцыйных народнікаў 70-х гадоў. У гэтых народнікаў была праграма, разлічаная на рэволюцыйную барацьбу з царскім урадам. Яны наіўна меркавалі, што праз сялянскую абшчыну, якая на самой справе ўжо разлагалася пад уплывам развіцця капіталізма (а факты я прыводзіла ў пачатку свайго выступлення), якая па сутнасці была выгоднай формай для прыкрыцця кулацкага засілля, што праз гэту абшчыну, лічылі народнікі, можна прысці да соцыялізма. Яны меркавалі, што капіталізм у Расіі і асабліва ў вёсцы не будзе развівацца. Ігнаруючы тую акалічнасць, што Расія ўжо ўступіла на шлях капіталістычнага развіцця, яны лічылі капіталізм у Расіі «выпадковым» з'явішчам. Гэта была галоўнейшая і важнейшая памылка народнікаў. Яны рабілі выгляд, што не заўважаюць рабочага класа, яны не разумелі таго, што рабочы клас вырасце ў гегемона рэволюцыйнага руху. Яны лічылі адзінай рэволюцыйнай сілай сялянства і не разумелі, што без саюза сялянства з рабочым класам і без кіраўніцтва рабочага класа сяляне адны не змогуць перамагчы царызм і памешчыкаў; гэтым самым народнікі перашкаджалі развіццю сапраўды рэволюцыйнай барацьбы супроць самаўладства.

Яны не разумелі законаў гістарычнага развіцця грамадства, мяркуючы, што гісторыю робяць «героі», за якімі слепа ідзе «натоўп».

Мала таго, народнікі не толькі не разумелі ролі і месца рабочага класа. Яны не разумелі і не ведалі сялянства. Яны лічылі селяніна гатовым соцыялістам, забываючы аб тым, што гэта быў дробны ўласнік, звязаны з найбольш адсталай формай гаспадаркі — дробнай вытворчасцю, і што, у сілу сваёй распыленасці і дробнаўласніцкага становішча, ён менш ахвотна падпадаўся арганізацыі і менш ахвотна ішоў у рэволюцыйны рух.

Неразуменне сялянства прывяло да таго, што народніцкая прапаганда сярод сялян, «хаджэнне ў народ», не знайшло волгуку ў сялянстве.

Зусім невыпадкова народнікі ў канцы 70-х гадоў вымушаны былі заявіць, што «прапаваць у сялянстве — гэта ўсёроўна, што біцца як рыба аб лёд». Гэты вывад прывёў народнікаў да тактыкі індывідуальнага тэрору. Але гэта тэрарыстычная тактыка мела вельмі сумныя вынікі для ўсяго народніцкага руху і, бясспрэчна, затрымала развіццё самастойнага рабочага руху і стварэнне рабочай партыі.

Вось што па гэтаму поваду гаворыцца ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)»:

«Народнікі адцягвалі ўвагу працоўных ад барацьбы з класам прыгнятальнікаў бескарыснымі для рэволюцыі забойствамі асобных прадстаўнікоў гэтага класа. Яны тармазілі развіццё рэволюцыйнай ініцыятывы і актыўнасці рабочага класа і сялянства.

Народнікі перашкаджалі рабочаму класу зразумець яго кіруючую ролю ў рэволюцыі і затрымлівалі стварэнне самастойнай партыі рабочага класа». Так абстаіць справа з народнікамі 70-х гадоў.

Народнікі 90-х гадоў ніякай рэволюцыйнай барацьбы супроць самадзяржаўя не вялі. Яны, наадварот, прапаведвалі прымірэнне з царскім урадам, быццам-бы царскі ўрад зможа «ўладзіць» усе тыя супярэчнасці, якія ёсць у грамадстве.

Ліберальныя народнікі ўсяляк стараліся не заўважаць гаротнае становішча беднаты ў вёсцы і яе бесчалавечную эксплаатацыю, разгортваючуюся класавую барацьбу на вёсцы. Яны ўсяляк усхвалялі развіццё кулацкіх гаспадарак. Народнікі 90-х гадоў сталі выразіцелямі інтарэсаў кулацтва. У далейшым яны перайшлі на пазіцыі партыі эсэраў, якая ў перыяд барацьбы рабочага класа за пролетарскую дыктатуру адкрыта стала ў лагер ворагаў соцыялістычнай рэволюцыі.

В. І. Ленін у сваёй кнізе «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?» выкрыў сапраўдны твар народнікаў і ідэйна іх канчаткова разграміў, як ворагаў соцыялістычнай рэволюцыі. Адначасова ў гэтай кнізе В. І. Ленін паказаў сапраўдных прыяцеляў народа, як барацьбітоў за яго шчасце, — рэволюцыйных марксістаў.

Спят марксізма-ленінізма пад кіраўніцтвам вялікіх геніяў чалавецтва В. І. Леніна і І. В. Сталіна атрымаў поўную перамогу на адной шостай частцы зямнога шара і пераможа ва ўсім свеце.

ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ АВАЛОДВАЕ ТЭОРЫЯЙ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

Пасля пастановы ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» інтэлігенцыя Першага клінгарадка па-большэвіцку ўзялася за авалоданне марксісцка-ленінскімі ведамі. Большасць выказала жаданне вывучыць гісторыю партыі самастойна.

Па жаданню інтэлігенцыі — дацэнтаў, асістэнтаў, урачоў і сясцёр Першага клінгарадка—партарганізацыя пачала рыхтаваць яшчэ ў лютым месяцы тэарэтычную канферэнцыю па твору Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?» Для гэтага была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Праслуханы лекцыі, арганізаваныя аддзелам прапаганды і агітацыі Варашылаўскага РК КП(б)Б і Домам партыйнага актыва па гэтай-жа працы Леніна. Праведзены 10 кансультацый у Клінгарадку, загадзя быў складзен план правядзення канферэнцыі, з указаннем літаратуры.

У рэзультаце гэтага тэарэтычная канферэнцыя прайшла на высокім ідэйна-палітычным узроўні, у якой прынялі ўдзел 65 чалавек, з іх членаў партыі 15 чалавек, комсамольцаў — 12 чалавек, беспартыйных — 38.

З дакладамі аб гэтай кнізе Леніна выступілі 3 таварышы: дацэнт тав. Стэльмашонак, дацэнт т. Дазорцава, асістэнт т. Шур. Загадзя з дакладчыкамі гутарыў штатны прапагандыст райкома партыі т. Лабецкі, які непасрэдна кіраваў канферэнцыяй. Па твору Леніна выступілі: дацэнт т. Кантаровіч, дацэнт т. Сосіна, доктар т. Заг, доктар т. Ліўшыц, доктар т. Керзон, доктар т. Гальбург і інш. Такім чынам, канферэнцыя насіла характар таварыскай дыскусіі жывога і актыўнага абгаварэння высунутых пытанняў. Гэта канферэнцыя выклікала выключную цікавасць да вывучэння марксізма-ленінізма.

А. Г. ГОЛАД,
сакратар партыйнага бюро Першага клінгарадка.

ДОБРЫ ПАЧЫН

Праведзеная па ініцыятыве бюро партарганізацыі Клінгарадка тэарэтычная канферэнцыя па кнізе В. І. Леніна з'яўляецца вялікай падзеяй у жыцці нашага калектыва.

Рыхтуючыся да гэтай канферэнцыі, я лішні раз упэўніўся, якая скарбніца ідэй заключаецца ў творах вялікага правадыра пролетарскай рэволюцыі В. І. Леніна. У гэтай кнізе, напісанай у канцы мінулага стагоддзя, ладзен бліскучы прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, які атрымаў у далейшым бліскучае пацверджанне на практыцы.

На канферэнцыі можна было навочна ўпэўніцца, што авалоданне большэвізмам становіцца неадлучнай часткай нашай работы.

Выступаўшыя з дакладамі таварышы ўпаўне справіліся з узятымі на сябе абавязацельствамі.

Я выказваю пажаданне, каб гэты пачын быў пачаткам сістэматычнага правядзення падобных канферэнцый.

І. ЛІПЕЦ,
доктар медыцынскіх навук

ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ДАПАМАГЛА МНЕ Ў САМАСТОЙНАЙ ВУЧОБЕ

Тэарэтычная канферэнцыя 1-га клінічнага гарадка, прысвечаная геніяльнаму твору вялікага настаўніка В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?» зрабіла на мяне моцнае ўражанне.

Тэарэтычная канферэнцыя прайшла на высока-ідэйным узроўні, пры актыўным удзеле шматлікай урачэбнай аўдыторыі. Аўдыторыя не была пасіўна, а кожны сур'ёзна падрыхтаваўся да канферэнцыі, глыбока вывучыўшы матэрыял.

Канферэнцыя з вялікай цікавасцю заслухала асноўныя даклады па твору В. І. Леніна і выступленні таварышаў, якія далі сур'ёзны і глыбока палітычны аналіз і разуменне кнігі Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць соцыял-дэмакратаў?».

Канферэнцыя дала мне зусім чоткае ўяўленне аб народніцтве, узброіла мяне разуменнем гістарычнай ролі пролетарыята і партыі Леніна — Сталіна, якая прывяла нас, пад кіраўніцтвам вялікіх геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна, да перамогі соцыялізма.

Канферэнцыя ўзброіла мяне мегадам далейшай работы па павышэнню тэарэтычнага ўзроўню, па сур'ёзнаму авалоданню каштоўнейшым укладам у скарбніцу марксізма-ленінізма, выдатнейшым творам—«Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)», створаным пры непасрэдным удзеле геніяльнага правадыра таварыша Сталіна.

Урач З. М. КАРАЕВА.

УДЗЕЛЬНІКІ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ*)

Пастанова Галоўнага Камітэта Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі ад 20 красавіка 1939 г.

Зацвердзіць удзельнікамі Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі, з занясеннем у Пачотную кнігу Усесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўкі:

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

(Працяг)

77. Калгас «Усход», Асіпавіцкага раёна, Магілеўскай вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 11,24 цэнтнера зярна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе — 210 гектараў і ў 1938 годзе — 216,3 гектара), сярэдні ўраджай кармавых буракоў па 359 цэнтнераў з гектара (з плошчы 3 гектары), сярэдні ўраджай капусты з 3 гектараў па 361,92 цэнтнера з гектара.

78. Рудый Пётр Іванавіч, старшыня калгаса «Усход», Асіпавіцкага раёна.

79. Казак Іван Кузьміч, брыгадзір калгаса «Усход», Асіпавіцкага раёна, які атрымаў з 2 гектараў у 1938 годзе па 32,22 цэнтнера гароху з гектара.

80. Кашко Аляксандр Васільевіч, брыгадзір калгаса «Усход», Асіпавіцкага раёна, які атрымаў у 1938 годзе з 1 гектара 25,8 цэнтнера азімай пшаніцы.

81. Фесько Дзмітрый Нікалаевіч, звеннявы калгаса «Усход», Асіпавіцкага раёна, які атрымаў у 1938 годзе з плошчы 2,6 гектара па 25,26 цэнтнера ячменю з гектара.

82. Калгас «Перамога», Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 11,2 цэнтнера зярна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе — 308 гектараў і ў 1938 годзе—208,9 гектара).

83. Калгас «Адраджэнне», Менскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 11,2 цэнтнера зярна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе — 162,4 гектара і ў 1938 годзе — 153,2 гектара).

84. Калгас «3-ці рашаючы», Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 11,11 цэнтнера зярна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе — 117,7 гектара і ў 1938 годзе — 102,7 гектара).

85. Калгас «Прагрэс», Тураўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937 — 38 гг. па 19,32 цэнтнера азімай пшаніцы з гектара (з плошчы ў 1937 годзе — 12 гектараў і ў 1938 годзе—14 гектараў).

86. Калгас «Абарона краіны», Васілевіцкага раёна, Палескай вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 17,71 цэнтнера проса з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе—20 гектараў і ў 1938 годзе — 28 гектараў).

87. Карана Арцём Гаўрылавіч, старшыня калгаса «Абарона краіны», Васілевіцкага раёна.

88. Калгас «Завет Леніна», Васілевіцкага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 17,39 цэнтнера проса з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 годзе —9 гектараў і ў 1938 годзе—22 гектары.

89. Смольскі Міхаіл Ляонавіч, старшыня калгаса «Завет Леніна», Васілевіцкага раёна.

90. Калгас «2-я пяцігодка», Магілеўскага раёна і вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 6,25 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г.—16 гектараў і ў 1938 г.—14,5 гектара).

91. Вейсман Майсей Хаімавіч, старшыня калгаса «2-я пяцігодка», Магілеўскага раёна.

92. Старажэнка Іван Захаравіч, машыніст ільнатрапальнай машыны «Антонава», калгаса «2-я пяцігодка», Магілеўскага раёна, які апрацаваў ў сезон 1938 г. 114,5 цнт. ільнавалакна.

93. Калгас «Першае мая», Магілеўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 4,52 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 10 гектараў і ў 1938 г. — 12,5 гектара).

94. Калгас «Шлях да соцыялізма», Горацкага раёна, Магілеўскай вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 4,24 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 68 гектараў і ў 1938 г. — 58 гектараў).

95. Урода Капітон Макаравіч, старшыня калгаса «Шлях да соцыялізма», Горацкага раёна.

96. Калгас «Свабода», Круглянскага раёна, Магілеўскай вобласці, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 4,24 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 37,5 гектара і ў 1938 г. — 35 гектараў).

97. Калгас імені Сталіна, Магілеўскага раёна, які атрымаў у сярэднім за 1937—38 гг. па 4,11 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 18 гектараў і ў 1938 г. — 33,5 гектара).

98. Калгас «Комінтэрн», Магілеўскага раёна, які здаў дзяржаве ў сярэднім за 1937—38 гг. па 3,42 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г.— 23 гектары і ў 1938 г. — 20 гектараў).

99. Таборка Іван Васільевіч, старшыня калгаса «Комінтэрн», Магілеўскага раёна.

100. Калгас «Правда», Талачынскага раёна, Віцебскай вобласці, які здаў дзяржаве ў сярэднім за 1937—38 гг. па 3,32 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 47 гектараў і ў 1938 г. — 56 гектараў).

101. Палякова Зінаіда Еўдакімаўна, старшыня калгаса «Правда», Талачынскага раёна.

102. Калгас «Рассвет», Жлобінскага раёна, Гомельскай вобласці, які здаў дзяржаве ў сярэднім за 1937—38 гг. па 3,04 цнт. ільнавалакна з гектара (з пасеўнай плошчы ў 1937 г. — 70,6 гектара і ў 1938 г. — 42 гектары).

103. Прановіч Іван Патапавіч — брыгадзір калгаса «Перамога», Стара-Ларожскага раёна, Менскай вобласці, які атрымаў у 1938 г. з пасеўнай плошчы, замаканаванай за брыгадай, па 5,05 цнт. ільнавалакна з гектара.

104. Вінаградава Елізавета Мітрафанаўна, звеннявая калгаса ім. Кірава, Кіраўскага раёна, якая атрымала ў 1938 г. з 1 гектара 10 цнт. ільнавалакна.

105. Лапкоўская Фядора Аляксееўна, звеннявая калгаса імені Ільіча, Полацкага раёна, Віцебскай вобласці, якая атрымала ў 1938 г. з 1 гектара 9,4 цнт. ільнавалакна.

106. Лапенка Ульяна Нікалаеўна, звеннявая калгаса імені Сталіна, Полацкага раёна, якая атрымала ў 1938 г. з 2 гектараў па 41,1 цнт. ільнатрасты з гектара.

107. Мікаскіна Екацярына Ефімаўна, звеннявая калгаса імені Калініна, Хойніцкага раёна, Палескай вобласці, якая атрымала ў 1938 г. з 1,3 гектара па 8 цнт. ільнавалакна з гектара.

108. Молатак Леон Лаўрэнцьевіч, звеннявы калгаса імені Варашылава, Дрысенскага раёна, які атрымаў у 1938 годзе з 1 гектара 11,87 цнт. селекцыйнага ільнасемя з гектара пры разрэджаным пасеве.

109. Матуль Марыя Людвігаўна, звеннявая калгаса імені Леніна, Дрысенскага раёна, якая атрымала ў 1938 годзе з 1 гектара 10,8 цнт. селекцыйнага ільнасемя пры разрэджаным пасеве.

110. Талкачоў Сяргей Іванавіч, звеннявы калгаса «За Власть Советов», Горацкага раёна, Магілеўскай вобласці, які атрымаў у 1938 годзе з 0,75 гектара па 10,76 цнт. селекцыйнага ільнасемя з гектара пры разрэджаным пасеве.

(Працяг будзе)

*) Пачатак гл. у «Звяздзе» за 8, 9 і 10 мая.

Звеннявая калгаса «Чырвоны партызан» (Петрыкаўскі раён, Палескай вобласці) Анатоля Сямёнаўна Піскун — за вывучэннем гісторыі партыі. У ліку перадавікоў сельскай гаспадаркі БССР тав. Піскун узнагароджана медаллю «За трудовое отличие». У дні XVIII з'езда партыі яна прынята ў рады ВКП(б). Фота Б. М. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

ЗА ПРАВА ЎДЗЕЛУ Ў ВЫСТАЎЦЫ

ЛЮБАНЬ. Трактарная брыгада Івана Пыжа (Любаньская МТС) у мінулым годзе выканала план трактарных работ на 143 проц. За перавыкананне плана і ўзорнае правядзенне палявых работ брыгада залічана ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года.

У гэтым годзе, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, трактарысты брыгады абавязаліся выпрацаваць на кожны трактар «ХТЗ» не менш 1.000 і на «У-2»— 700 гектараў і зэканоміць 15 проц. гаручага.

Свае абавязацельствы трактарысты падмацоўваюць канкрэтнымі справамі: штодзённа перавыконваюць нормы, працуюць без аварый і прастояў, даюць высокую якасць работ. Вось, напрыклад, трактарыст Павел Курда, які заверджан удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, працуючы на трактары «У-2», штодзённа выпрацоўвае 6—7 гектараў пры норме 3,5 гектара. За апошнія 15 дзён ён апрапаваў 97,6 гектара.

Трактарыст т. Маруга за вясну апрацаваў на калёсным трактары 126 гектараў і засеяў радковай сеялкай 160 гектараў (вясновая норма сяўбы—120 гектараў). Працуючы напярэдадні мая ў калгасе «Будаўнік», т. Маруга і Алесь Яшчэня засявалі штодзённа па 26 гектараў кожны.

К. ХОМЧАНКА.

СПЕЦЫЯЛІСТЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ— УДЗЕЛЬНІКІ ВЫСТАЎКІ

Галоўны выставачны камітэт зацвердзіў удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 9 спецыялістаў сельскай гаспадаркі БССР. Сярод заверджаных: агратэхнік калгаса «Чырвоны Кастрычнік», Тураўскага раёна, І. Ц. Цеслюк, які ў мінулым годзе забяспечыў калгасу сярэдні ўраджай бульбы з плошчы ў 43 гектары па 199 цэнтнераў з кожнага гектара.

Заверджан удзельнікам выстаўкі Д. І. Мацюшкоў, які працуе ўчастковым аграномам Полацкай МТС. У 1938 годзе ён у калгасах свайго ўчастка ўвёў правільныя севазвароты і дабіўся значнага павышэння ўраджайнасці. За высокія ўраджаі тры калгасы, абслугоўваемыя тав. Мацюшковым, заверджаны ўдзельнікамі выстаўкі.

Права ўдзелу ў выстаўцы заваявалі старшы бухгалтар Віцебскай МТС М. Б. Фрушын, які наладзіў узорную пастаноўку ўчота ў МТС і калгасах; агрономхмелявод Белбродтрэста Н. А. Капько, старшы агранам Дрысенскага сортавыпрабоўчага ўчастка І. М. Огнеў, старшы заатэхнік заслаўскага райземаддзела Н. І. Каралёў і іншыя. (БЕЛТА).

УЗМАЦНІЦЬ АХОВУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ УЛАСНАСЦІ

У сувязі з наступленнем вясенне-летняга перыяду па БССР пачасціліся выпадкі пажараў, асабліва ў сельскіх мясцовасцях. У радзе калгасаў зусім слаба пастаўлена процівапажарная ахова. Так, у апошніх чыслах сакавіка старшыня калгаса «Ленінскі шлях», Машчэніцкага сельсавета, Бялыніцкага раёна, Усаў зняў з помпы набіўны рукаў і перадаў яго МТС для перакачкі бензіна, у выніку пажарная помпа вышла са строю. Такія адносіны да пажарнага інвентара з'яўляюцца злачынствам.

Пажары часцей за ўсё ўзнікаюць ад неахайнага абыходжання з агнём. У соўгасе Горкі-Абчак, Менскага раёна, была пакінута без догляду печ для варкі корму, ад чаго згарэў свінарнік. Увесь процівапажарны інвентар соўгаса быў няспраўным. У калгасе імені Сталіна, Аляксандраўскага сельсавета, Гарадоцкага раёна, пажарам знішчана канюшня, згарэла 24 коні. Прычына — неаспярожнае абыходжанне з агнём: вартаўнік калгаса спаў у канюшні на сене і курыў. Сам вартаўнік атрымаў моцныя абпалы.

Вельмі часта пажары з'яўляюцца вынікам безнагляднасці дзяцей. 5-гадовы сын калгасніка Міронава з сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Шклоўскага раёна, падпаліў салому. Узнік вялікі пажар, які нанёс калгасу страт на ізесяткі тысяч рублёў. У калгасе «Зорка», Кармянскага раёна, ад дзіцячых забаў узнік пажар, якім знішчаны 2 канюшні і 2 свірны.

Падобных прыкладаў можна прывесці многа. Неабходна памятаць, што адным з метадаў шкодніцкай работы ворагаў народа з'яўляюцца падпалы. Былі выпадкі, калі дыверсанты для гэтай мэты пад рознымі прадлогамі падсоўвалі дзецям запалкі.

Прыведзеныя факты паказваюць, што не ўсе кіраўнікі раёнаў, сельсоветаў і асабліва калгасаў удзяляюць належную ўвагу барацьбе з пажарамі. Слаба арганізавана масава-растлумачальная работа сярод насельніцтва. Не вялецца дастатковай барацьбы з парушальнікамі процівапажарных правіл.

У рэспубліцы ёсць нямала добрых прыкладаў узорнай пастаноўкі процівапажарнай аховы (Бярэзінскі, Веткаўскі і рад іншых раёнаў). Партыйныя і совецкія арганізацыі тут рэгулярна займаюцца пытаннямі пажарнай безапаснасці.

Трэба памятаць, што за пастаноўку пажарнай аховы нясуць персанальную адказнасць старшыні калгасаў, дырэктары прадпрыемстваў, работнікі пажарнавартавой аховы. Кожны грамадзянін павінен заўсёды памятаць 131 артыкул Сталінскай Канстытуцыі аб тым, што ён абавязан берагчы і ўмацоўваць грамадскую, соцыялістычную ўласнасць.

А. Г. ЗЛОТНІК,
намеснік начальніка аддзела пажарнай аховы НКВД БССР.

НОВЫЯ БУДЫНКІ РАЁННЫХ ДРУКАРАНЬ

У 4-х раённых цэнтрах Менскай вобласці — Рудзенску, Чырвонай Слабадзе, Уздзе і Старобіне — ідзе будаўніцтва новых памяшканняў для раённых друкарань, на што асігнавана 455 тысяч рублёў. У гарадскім пасёлку Узда ўжо ў асноўным гатоў новы корпус для рэдакцыі раённай газеты і друкарні. Гэта — прыгожы каменны будынак. Тут размесціцца друкарня з пэхамі — наборным, друкарскім, а таксама рэдакцыя, фоталабараторыя, бібліятэка і пакой адпачынку.

АБ МАСТАЦКАЙ АСВЕЦЕ Ў БССР

«Дайце нам лекцыю аб выяўленчым мастацтве!» Такі быў першы за 10 год зварот у мастацкае вучылішча з боку аднаго з дырэктараў сярэдняй школы. Вельмі рэдкі факт. Але ён характарызуе стан мастацкай асветы, асабліва ў галіне выяўленчага мастацтва. Сярэдняя школа павінна адыгрываць нямалую ролю ў пастаноўцы мастацкага выхавання моладзі. Аднак гэтым у школах амаль не цікавяцца. Маляванне выкладаецца толькі на працягу 5 год, пры гэтым 4 годы ім кіруюць непадрыхтаваныя групаводы; у 5 класе па праграме Наркамасветы РСФСР прадастаўлена на маляванне 39 гадзін у год, а ў БССР — яшчэ менш. З шостага класа клопаты аб далейшым мастацкім развіцці навучаючыхся чамусьці спыняюцца. Гурткавая работа ў старэйшых класах не праводзіцца, а калі дзе і праводзіцца, то без аплаты працы педагога— на грамадскіх пачатках.

Дырэктары школ расходуюць сродкі на ўсякія гурткі, але толькі не на гурткі малявання і жывапісу.

Усё гэта прыводзіць да таго, што, канчаючы сярэднюю школу, вучань не атрымлівае нават самай элементарнай, патрэбнай усякаму інтэлігенту, выяўленчай граматы.

У нас ёсць яшчэ многа школьнікаў, якія не ведаюць, хто такія Рэпін, Сурыкаў, Левітан, Тыцыан, Веласкез. Ніякіх лекцый не наладжваецца паваг аб нашым вырасшым совецкім мастацтве, аб цудоўнай спадчыне, пакінутай класікамі вялікага рускага народа. Гутаркі-ж аб мастацтве з'яўляюцца дасканалым дадаткам да праходжання гісторыі. Колькі ёсць, напрыклад, дасканалых ілюстрацый у дапамогу вывучэнню гісторыі нашай слаўнай комуністычнай партыі!

Гэтыя пытанні не асвятляюцца ў гутарках і лекцыях. У нас няма таксама ні аднаго музея, дзе вучань мог-бы самастойна паглядзець узоры мастацтва, развіць свой мастацкі густ і крытычныя адносіны да твораў мастацтва.

У гарадах і калгасах, на фабрыках і заводах ёсць таленавітыя людзі, якія імкнуцца авалодаць вобразнай тэхнікай алоўка і кісці. Частка іх трапляе ў адзінае мастацкае вучылішча, што ў Віцебску. Тут адбываецца адбор найбольш здольных і адносна падрыхтаваных. Каля года іх пераключаюць на засваенне таго, што яны павінны былі-б ужо ведаць, пры іншай пастаноўцы работы, у сярэдняй школе.

Віцебскае мастацкае вучылішча мае жывапісна-педагагічнае аддзяленне. На яго паступаюць зусім не для таго, каб стаць у далейшым педагогамі. Мэта паступлення — стаць мастаком. Канчыўшыя гэтае вучылішча перш за ўсё імкнуцца паступіць у мастацкую вышэйшую навучальную ўстанову, а калі для гэтага няма даных — астацца на афарміцельскую работу, надзвычайна выгадную ў матэрыяльных адносінах, дзякуючы поўнай адсутнасці кантролю і ўсё яшчэ не арганізаванай рабоце выяўленчага камбіната.

Патрэба ў нас у работніках выяўленчага мастацтва велізарная, а Ўпраўленне па справах мастацтваў і Наркамасветы кожны год б'юцца, не ведаючы, як размеркаваць скончыўшых Віцебскае мастацкае вучылішча. Ясна, што профіль гэтага вучылішча не адпавядае рэальным патрэбам.

Толькі агідныя адносіны да падрыхтоўкі кадраў для мастацтва прывялі да таго, што мастацкае вучылішча на працягу раду год працуе ў надзвычайнай цеснаце, без чытальні, без выставачнай залы і неабходных кабінетаў па пластычнай анатоміі і перспектыве, без залы для грамадска-культурных мерапрыемстваў, без палатна для жывапісу.

Каб унікнуць усяго гэтага, трэба змяніць сістэму мастацкай асветы. Першая ступень — гэта мастацкая школа юных даравання, якая павінна быць забяспечана высокакваліфікаванымі мастакамі-выкладчыкамі. У яе збіраюцца дзеці, маючыя яўна выражаныя здольнасці да выяўленчых мастацтваў. Яна ахапляе 5 апошніх класаў дзесяцігодкі.

На аснове вопыту дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва пры менскім гарадскім аддзеле народнай асветы можна сцвярджаць, што за 5 год, праходзячы поўны курс агульнаадукацыйных прадметаў, сапраўды таленавітых дзяцей у поўнай меры можна падрыхтаваць да паступлення ў мастацкую вышэйшую навучальную ўстанову на жывапіснае, скульптурнае або архітэктурнае аддзяленні. За 5 год можна выявіць нахіл і здольнасць вучня і дапамагчы яму верна знайсці свой шлях.

Мастацкае вучылішча павінна складацца з аддзяленняў, падрыхтоўваючых работнікаў па тых спецыяльнасцях, у якіх сапраўды мае патрэбу БССР (дэкаратары, інструктары па асобных галінах народнай творчасці і прамысловасці настаўнікі малявання з уклам мастацтвазнаўства). Грунтоўная падрыхтоўка па выяўленчаму мастацтву ў школе дасць магчымасць аддаць вялікую колькасць гадзін на спецыялізацыю — вывучэнне тэхнікі той ці іншай вытворчасці — для інструктараў народнай творчасці, вывучэнне тэорыі і гісторыі (мастацтвазнаўства) для настаўнікаў ізесяцігодак і сярэдніх навучальных устаноў (немастацкіх).

Мастацкае вучылішча павінна папаўняцца з ліку вучняў мастацкай школы, маючых нахіл да дэкаратыўных работ і педагагічна-мастацтвазнаўчай работы. Задачы школы — выявіць гэтыя нахілы і дапамагчы вучням зразумець сябе. Курс вучылішча павінен быць разлічан на 3—4 годы навучання, у залежнасці ад складанасці таго ці іншага аддзела.

Адначасова з мастацкай школай у раёнах павінны прапаваць дзіцячыя студыі, падрыхтоўваючыя для паступлення ў старэйшыя класы мастацкай школы і ў мастацкія вучылішчы. Мастацкія студыі для дарослых павінны камплектавацца з ліку прадстаўнікоў самадзейнага мастацтва. Пры палацах піонераў, заводах, фабрыках, школах павінны існаваць гурткі выяўленчага мастацтва, ставячыя сабе мэтай даваць агульную мастацкую асвету.

Неабходна асобна адзначыць аб перагляндзе вучэбных планаў сярэдніх школ, дзе мастацкаму выхаванню (а маляванню тым больш) павінна быць удзелена больш месца, а ў малодшых класах перадаць гэтую справу спецыялістам. Таксама трэба адзначыць, што ў бюджэтах фабкомаў, клубаў, дамоў соцкультуры павінны быць вылучаны сродкі на гурткі выяўленчага мастацтва і кіраўніцтва гэтай справай.

Задача-ж вышэйшай мастацкай навучальнай установы — гэта падрыхтоўка высокакваліфікаваных творчых работнікаў: архітэктараў, скульптараў, жывапісцаў, дэкаратараў і мастацтвазнаўцаў. Курс навучання—пасцігаловы на творчых аддзяленнях і чатырохгаловы на мастацтвазнаўчым.

Такія нашы канкрэтныя прапановы. У трэцяй пяцігодцы яны могуць і павінны быць ажыццёўлены.

Першы з'езд мастакоў БССР адзначыў, што астаткі школніцкай работы па падрыхтоўцы кадраў, меўшыя месца ва Ўпраўленні па справах мастацтваў і Наркамасветы, ліквідуюцца вельмі марудна.

Падняцце на прынцыповую вышыню справы арганізацыі мастацкай асветы ў БССР—адна з першачарговых задач Наркамасветы і Ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.

М. А. КЕРЗІН,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР,
Мастак Л. М. ЛЕЙТМАН.

ГАСТРОЛЬНАЯ ПАЕЗДКА ФІЛАРМОНІІ

Курортнае ўпраўленне Маскоўскай філармоніі запрасіла хор Дзяржаўнай філармоніі БССР на гастролі ў буйнейшыя курорты Саюза — Сочы, Мацэсту, Ялту, Кіславодск і інш. 14 мая хор у саставе 52 чалавек выязджае на гастролі. У яго рэпертуары — творы рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў, беларускія народныя песні.

(БЕЛТА).

ШЫРЭЙ ДАРОГУ БОЛЬШЭВІЦКІМ НАВАТАРАМ ТЭХНІКІ

Геніяльны даклад таварыша Сталіна і гістарычныя рашэнні з'езда партыі выклікалі новую хвалю соцыялістычнага спаборніцтва. Велізарны ўздым адчуваецца сярод наватараў соцыялістычнай тэхнікі —рацыяналізатараў і вынаходцаў.

Стаханаўцы інжынераў, тэхнікаў і канструктараў натхняе на творчасць на выкарыстанне тэхнікі да дна глыбокая любоў да сваёй соцыялістычнай радзімы, імкненне выканаць указанні нашага любімага правадыра і настаўніка—таварыша Сталіна.

Магутны стаханаўскі рух вылучыў з асяроддзя рабочых, інжынерна-тэхнічнай інтэлігенцыі і калгаснікаў дзесяткі тысяч новых вынаходцаў і рацыяналізатараў, якія ўдасканальваюць вытворчасць і рухаюць уперад навуку і тэхніку.

Цяпер, калі наша партыя і ўвесь совецкі народ працуюць над ажыццяўленнем вялікага плана трэцяй сталінскай пяцігодкі, вынаходніцтва і рацыяналізацыя павінны развівацца ўсё шырэй. Неабходна ўсяк падтрымліваць творчую ініцыятыву вынаходцаў і рацыяналізатараў, падтрымліваць вялікія і малыя пачынанні.

Вынаходцы і рацыяналізатары прадпрыемстваў, навукова-даследчых устаноў і калгасаў унеслі і ўносяць дзесяткі і сотні каштоўных вынаходніцтваў і ўдасканальванняў, накіраваных на павышэнне прадукцыйнасці працы, павелічэнне выпуску прадметаў шырокага спажывання, паляпшэнне якасці прадукцыі, паляпшэнне ўмоў працы і тэхнікі безапаснасці.

Значна ўзмацніўся прыток рацыяналізатарскіх прапаноў на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці рэспублікі. Толькі па адной швейнай прамысловасці ўнесена 150 прапаноў з гадавой эканоміяй у 607.000 рублёў. Вялікае значэнне мае прапанова аб змяненні метада апрацоўкі рукавоў ватнікаў па менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік», якая дае гадавую эканомію ў 25.000 рублёў.

61 прапанову ўнеслі рацыяналізатары швейнай фабрыкі імені Дзержынскага ў Бабруйску. Найбольш каштоўныя з іх: прыстасаванне для прышыўкі сутажа, апарат для абмелкі і абрэзкі ніза пілжака, апарат для друкавання ярлыкоў, засперагальнік да пугавічнай машыны і інш.

За апошнія годы ў шчаціна-шчотачнай прамысловасці БССР механізаван цэлы рад прапаёмкіх працэсаў, што дало магчымасць павялічыць вытворчую праграму прадпрыемстваў гэтай галіны з 10 мільёнаў у 1935 годзе да 24 мільёнаў у 1938 годзе і значна палегчыць працу рабочых.

Вынаходцам гомельскай шчаціннай фабрыкі механікам тав. Капілоўскім механізаван і ўдасканален працэс выцягвання шчаціны. У сучасны момант распрацавана канструкцыя станка па механізацыі надзвычай цяжкага прапаёмкага працэса, па выпрацоўцы бартовай ткані, які да гэтага часу рабіўся ўручную. Гэты станок будзе пушчан у пробную эксплаатацыю ў маі гэтага года.

Вынаходцы і рацыяналізатары механічнага цэха менскай шчотачнай фабрыкі імені Крупскай у чэрвені XVIII з'езда партыі датэрмінова закончылі выраб трох аўтаматаў для наборкі ботавых шчотак. Гэтыя аўтаматы раней імпартыраваліся з-за граніцы.

Уступіўшы ў спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, рацыяналізатары шчаціна-шчотачнай прамысловасці ў колькасці 40 чалавек узялі на сябе абавязацельства даць у 1939 годзе эканомію ад рацыяналізатарскіх прапаноў 95.000 рублёў, у тым ліку па гомельскай шчаціннай фабрыцы 50.000 рублёў, віцебскім шчотачным камбінаце — 15.000 рублёў.

На прадпрыемствах скурана-абутковай прамысловасці за 1938 год паступіла 539 прапаноў, з іх 255 ужо ўнядроны і далі эканомію 466.000 рублёў. Выпаходцам і рацыяналізатарам выплачаны прэміі ў суме 34.000 рублёў.

Паказальны даныя аб росце тэхнічнай творчай думкі на прадпрыемствах скурана-абутковага трэста ў першыя тры месяцы 1939 года.

Фабрыка імені Кагановіча ў першым квартале 1938 года атрымала эканоміі ад 7 рацыяналізатарскіх прапаноў 3.500 рублёў, а за першы квартал 1939 года ўнесеныя 27 прапаноў далі 56.000 рублёў эканоміі. Найбольш важнай прапановай, якая ўнядрона ў вытворчасць у перыяд работы XVIII з'езда ВКП(б), з'яўляецца вынайдзены механікам т. Гольдзіным аўтамат для засыпкі швікоў да каблучнага прэса, які дае эканомію за год у 20.000 рублёў. Таксама часткова ўнядрона прапанова рабочага тав. Булкіна аб прымяненні да калодак жалезных пласцін, замест скураных, што дае эканомію скуры і амаль знішчае зношванне калодак. Даная прапанова дае гадавую эканомію 25.000 рублёў.

У дні гістарычнага XVIII з'езда ВКП(б) тэхнарук скургалантарэйнай фабрыкі імені Куйбышэва т. Шыфрын унёс вельмі каштоўную рацыяналізатарскую прапанову. Да гэтага часу металічныя пліты для накату ўзору на скурах фабрыка атрымлівала з Ленінграда. Гэта звязана з вялікімі расходамі. Рацыяналізатар тав. Шыфрын рашыў выраблянь гэтыя пліты ў механічнай майстэрні сваёй фабрыкі. Прапанова яго рэалізавана, прадпрыемства спыніла выпіску пліт з Ленінграда.

Прапанова тав. Шыфрына дасць 20.000 рублёў эканоміі і замест 3—4 узораў на старых плітах, фабрыка на сваіх плітах выпускае цяпер 8—9 відаў розных узораў.

Выдатных поспехаў дабіліся рацыяналізатары шклопрамысловасці. На шклозаводзе імені Дзержынскага ў Барысаве алмазчыкам тав. Каспяровічам замест аднаго жала, якое наносіць насечкі на цветніках, устаноўлены пяць, што павялічыла ў 4 разы прадукцыйнасць на даным працэсе і дасць гадавую эканомію ка 10.000 рублёў.

Па акуляравай фабрыцы ў Віцебску ўнядрона рацыяналізацыя майстра шліфавальнага цэха тав. Косараўскага, які прапанаваў прымяніць для шліфоўкі шкла чашкі вялікага размеру, што павялічыла вытворчасць на надзвычай працаёмкім працэсе і дае эканоміі ў год каля 30 тыс. руб.

Вялікая творчая работа па механізацыі і рацыяналізацыі тэхналагічнага працэса ў торфпрамысловасці праводзіцца работнікамі Навукова-даследчага інстытута інжынерам тав. Д. І. Шухманам і дацэнтам тав. Чарно. Ручныя граблі-варушыцелі, прапанаваныя дацэнтам Чарно, павялічылі прадукцыйнасць працы ў 2—2,5 раза, аблягчылі працу тарфяніц.

Да гэтага часу на гідраторфе працэс перакаткі труб з'яўляецца даволі працаёмкім і цяжкім. З агульнай колькасці траўм на гідраторфе ў 1937 г. 12,2 проц. падае на абойшчыкаў і 23 проц.—на адносчыкаў труб.

Вынайдзены станок па перакатцы труб масаправода на палях разліву выпрабоўваўся на Асінторфе ў сезоне 1938 г. Апрача аблягчэння ўмоў працы і знішчэння прычын, параджаючых траўматызм, змяншаецца патрэбнасць у рабочай сіле на гэтым працэсе больш чым на палавіну. Такіх прыкладаў можна было прывесці значна больш.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) таварыш Молатаў падкрэсліў значэнне вынаходніцтва ў справе выканання вялікага плана трэцяй сталінскай пяцігодкі. «У нас адкрываюцца новыя велізарныя рэзервы, як толькі праявім сапраўдныя клопаты аб нашых шматлікіх вынаходцах, рацыяналізатарах і іх памочніках. Трэба актыўна, матэрыяльнымі і грамадскімі мерамі, заахвочваць і прасоўваць гэту справу, як вучыць гэтаму таварыш Сталін».

Соўнарком Саюза ССР ад 22 ліпеня 1936 года ў сваёй пастанове аб рэарганізацыі кіраўніцтва вынаходніцкай справай усю адказнасць за ўлік, разгляд, прапраноўку і ўнядрэнне прапаноў усклаў на гаспадарчыя арганізацыі — наркаматы, трэсты, упраўленні.

Прайшло ўжо больш двух год. Большасць нашых наркаматаў, трэстаў нічога яшчэ не зрабілі для арганізацыі вынаходніцкай справы.

Ні ў адным наркамаце БССР да гэтага часу няма адказных за пастаноўку вынаходніцкай работы. Наркаммясцпром, Наркамхарчпром і інш. па сутнасці не ведаюць, што робіцца на прадпрыемствах у справе пастаноўкі і кіраўніцтва вынаходніцтвам.

Да гэтага часу няма яснасці і ў пытанні фінансавання вынаходніцтва і рацыяналізацыі. Так, ні ў адным наркамаце, трэсце і на многіх прадпрыемствах БССР не створаны фонды салзейнічання вынаходніцтву.

У наркаматах-жа РСФСР як у саюзных і агульнарэспубліканскіх, так і ў мясцовых ужо даўно створаны і працуюць укамплектаваныя спецыялістамі аддзелы па вынаходніцтву, падпарадкаваныя непасрэдна наркому ці яго намесніку.

Гэтыя аддзелы ажыццяўляюць кіраўніцтва і нясуць поўную адказнасць за пастаноўку ўліку, разгляд рацыяналізатарскіх прапаноў, планаванне вынаходніцтва і ўнядрэнне прапаноў на вытворчасці. У іх ёсць неабходная фінансавая база для ажыццяўлення вынаходніцтваў.

Ні адзін наркамат БССР да гэтага часу не выдаў хаця-б часовую інструкцыю аб парадку разгляду, прахаджання ўчоту і хаванню прапаноў па вынаходніцтвах і тэхнічных удасканальваннях, а таксама інструкцыю аб фондзе салзейнасці вынаходніцтву, не гледзячы на тое, што такія ўжо даўно выданы наркаматамі РСФСР (Наркамгас, Наркаммясцпром, Наркамлегпром).

Такія адносіны гаспадарнікаў да вынаходніцтва — нецярпімы, яны перашкаджаюць развіццю творчай ініцыятывы рабочых мас.

Ворагі народа, арудаваўшыя на радзе ўчасткаў гаспадарчай работы, рабілі ўсё, каб заглушыць творчую ініцыятыву вынаходцаў і рацыяналізатараў. Вынікі шкодніцтва на гэтым важнейшым участку ліквідуюцца надзвычай марудна і нерашуча.

За становішча рацыяналізатарскай справы нясуць прамую адказнасць профсаюзы, але большасць нашых прафесіянальных арганізацый не кантралююць і не кіруюць гэтай важнейшай справай.

Пара наркаматам, трэстам узяцца за пастаноўку і кіраўніцтва справай вынаходніцтва на прадпрыемствах, трэба, каб кожны наркамат, трэст стаў штабам рацыяналізатарскай работы, распрацаваў чоткую праграму дзеянняў.

Разам з гаспадарнікамі партыйныя і профсаюзныя арганізацыі павінны акружыць рацыяналізатараў і вынаходцаў увагай і клопатамі, заахвочваць іх ініцыятыву, акружыць іх пачотам, як герояў працоўнага фронта, якія аддаюць свае сілы і веды, свой талент справе ўмацавання магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы.

А. ГЛОЗМАН.

АНТЫПОЛЬСКАЯ КАМПАНІЯ ГЕРМАНСКАГА ДРУКУ

За апошнія дні германскі фашысцкі друк рэзка ўзмацніў антыпольскую кампанію. Германскія газеты стракацяць паведамленнямі і артыкуламі, якія па свайму зместу, тону і загалоўках вельмі нагадваюць кампанію, разгорнутую германскім фашысцкім друкам супроць Чэхаславакіі ў верасні 1938 года і напярэдадні яе акупацыі. Так, патрыятычныя дэманстрацыі і мітынгі, якія адбываюцца ў Варшаве і ў іншых гарадах Польшчы, германскія газеты называюць «антыгерманскімі правакацыямі», а пэ адрасу ўдзельнікаў гэтых дэманстрацый абрушваюцца з лаянкай. Характэрна, што газеты, у прыватнасці «Фелькішэр беабахтэр», публікуюць артыкулы, у якіх прабуюць даказаць «нямецкі характар» Варшавы, падобна таму, як яны пісалі аб «нямецкім характары» акупіраванай германскімі войскамі Прагі. Адначасова германскія газеты пішуць аб «тэрарыстычных актах», якія нібы робяцца палякамі ў адносінах да пражываючых у Польшчы немцаў.

Выступленне польскага міністра замежных спраў Бека спаткана фашысцкім друкам з вялікім раздражэннем. «Фелькішэр беабахтэр» піша, што гэтая прамова выклікала ў Германіі «вялікае расчараванне», а самога Бека называе «дрэнным адвакатам брытанскай палітыкі».

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ГЕРМАНСКІХ ШТУРМАВІКОЎ У ДАНЦЫГУ

ВАРШАВА, 10 мая. (ТАСС). Газета «Экспрэс поранны» ў заметцы пад загалоўкам «З'езд палазроных турыстаў у Данцыгу» звяртае ўвагу на тое, што ў апошнія дні з Усходняй Прусіі ў Данцыг прыбывае вялікая колькасць немцаў, адзетых у форму германскіх штурмавікоў.



Да ваенных дзеянняў у Кітаі. НА ЗДЫМКУ: артылерыя кітайскай арміі на пазіцыі. Фотахроніка ТАСС.

ЗАЯВА ПОЛЬСКАГА ЎРАДА ПА ПЫТАННЮ АБ ДАНЦЫГУ

ПАРЫЖ, 10 мая. (ТАСС). Лонданскі карэспандэнт агенцтва Радыё перадае, што па атрыманых вестках, польскі ўрад асведаміў урады Францыі і Англіі, што ён лічыць нясвоечасовымі якія-небудзь змяненні ў статуце, устаноўленым Лігай нацый для Данцыга. У паведамленні польскага ўрада ўказваецца, што змяненні ў статуце Данцыга будуць магчымы толькі пасля таго, як адносіны паміж Польшчай і Германіяй набудуць яснасць, як гэтага жадае польскі ўрад і як ён аб гэтым заявіў у сваім нядаўнім мемарандуме германскаму ўраду.

ГЕРМАНСКІЯ ПАТРАБАВАННІ ЛІТВЕ

ВАРШАВА, 10 мая. (ТАСС). Польскія газеты ў паведамленнях з Каунаса перадаюць весткі аб новых патрабаваннях, прад'яўленых Германіяй Літве. Згодна гэтых вестак, у час адбываўшыхся ў Берліне літоўска-германскіх гандлёвых перагавораў Германія высунула перад Літвой наступныя патрабаванні:

45 процантаў літоўскага экспарта павінна накіроўвацца ў Германію, а 45 проц. імпарта ісці з Германіі; увесь марскі гандаль Літвы павінен праходзіць праз Клайпедскі порт; Літва абавязваецца адмовіцца ад будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў у краіне і павінна прадастаўляць заказы існуючай у Клайпедскай вобласці прамысловасці.

Агенцтва Экспрэс паведамляе, што з прычыны супраціўлення, аказваемага літоўскім урадам гэтым патрабаванням Германіі, у Каунас прыбыў з спецыяльным даручэннем германскі чыноўнік доктар Клейст — даверана асоба Рыбентропа.

ХВАЛЯВАННІ Ў КЛАЙПЕДСКАЙ ВОБЛАСЦІ

ВАРШАВА, 10 мая. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Экспрэс, у Клайпедскай (Мемельскай) вобласці прадаўжаюцца хваляванні. У вёсцы Довілян (паблізу Клайпеды) адбылася крывавая сутычка паміж германскім паліцэйскім атрадам і літоўскімі сялянамі. Трое сялян забіты, адзін паліцэйскі цяжка ранен. Прычынай сутычкі было адмаўленне сялян выдаць прадукты харчу германскаму камісару.

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 9 мая. (ТАСС). Учора ў палаце абшчын адбыліся спрэчкі ў сувязі з прыняццем у другім чытанні законапраекта аб увядзенні воінскай павіннасці ў Англіі. Выступаючы ад імені лейбарыстскай апазіцыі, Этлі заявіў, што ўрад не змог даказаць неабходнасць увядзення ўсеагульнай воінскай павіннасці ў даны момант. Этлі выразіў апасенне, што ўрад не спыніцца на гэтым кроку і паспрабуе ажыццявіць мілітарызацыю працы. «У імя абароны свабоды мы будзем пазбаўлены нашых свабод», — сказаў ён.

З абаронай законапраекта выступіў Лойд-Джордж.

Ад імені ўрада выступіў ваенны міністр Хор-Беліша.

Увядзеннем усеагульнай воінскай павіннасці, заявіў ён, урад намеран падкрэсліць сваю цвёрдую рашымасць прыняць усе неабходныя крокі для абароны краіны і для выканання сваіх міжнародных абавязацельстваў.

Папраўка лейбарыстаў да ўрадавага законапраекта была адхілена большасцю 387 галасоў супроць 145.

Ваенны парад у Рыме

РЫМ, 10 мая. (ТАСС). Учора ў Рыме адбыўся ваенны парад, на якім прысутнічалі Мусаліні, галоўнакамандуючы германскай арміяй генерал Браухіч, а таксама германская і іспанская ваенныя дэлегацыі.

Пасля парада Мусаліні сказаў прамову, у якой гаварыў аб «сіле» італьянскай зброі і «рашучасці» Італіі.

Італьянскі афіцыёз «Джорнале д'Італіа», каментуючы парад, заяўляе, што «Італія мае бамбардыровачную авіяцыю, здольную даляцець да любога французскага горада, а таксама да Лондана, скінуць там тоны бомб і вярнуцца неадкладна, каб узяць новыя бомбы і зноў аднавіць напад».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

Контратакі японскіх войск у раёне Наньчана не мелі поспеху. Кітайскія войскі прадаўжаюць стрымліваць свае пазіцыі, паступова набліжаючыся да горада.

Часці кітайскіх войск, якія дзейнічаюць на паўночны захад ад Наньчана, 7 мая занялі рад пунктаў, што за 20—25 клм. на поўнач ад Упіна.

За апошнія дні на поўдні правінцыі Хубэй адзначаецца значнае ўзмацненне дзеянняў кітайскіх партызан. У ноч на 3 мая партызаны раптоўна атакавалі Цзінюнчэн (на паўночны захад ад Дао) і знішчылі японскі атрад у 500 чалавек. Недалёка ад Пуці партызаны ўзарвалі чыгуначны мост. У сувязі з гэтым чыгуначныя зносіны паміж правінцыямі Хубэй і Хунань спынены.

5 мая перадавыя кітайскія атрады атакавалі Аньцын (сталіца правінцыі Аньхуэй). Японскія часці пад націскам наступаючых кітайскіх атрадаў вымушаны былі ўкрыцца за гарадскімі сценамі. Частка наступаючых кітайскіх войск уварвалася ў горад, на вуліцах якога адбыўся жорсткі бой. Кітайскія атрады знішчылі японскія склады боепрыпасаў і харчовыя склады. Пашкоджан аэрадром і спален ангар.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

На поўдні правінцыі Шаньсі кітайскія часці ачысцілі ад праціўніка некалькі вёсак. У сучасны момант баі адбываюцца за 15 кілометраў ад Хачжоу.

Зараз стала вядома аб паўстанні 400 чалавек са знаходзіўшагася ў Юнчэне атрада войск марыянетачнага ўрада. Перабіўшы афіцэраў, салдаты далучыліся да кітайскіх партызан.

За апошнія дні значна ўзмоцнілася актыўнасць японскай авіяцыі на поўдні і ўсходзе правінцыі Шаньсі. Авіяцыя бамбардыруе буйныя населеныя пункты правінцыі.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

На поўдзень ад Кантона з пераменным поспехам прадаўжаюцца баі каля Цзянмыня і Сіньхоя. 7 мая японцы атакавалі Дачэ (на захад ад Цзянмыня). Аднак, сустрэўшы ўпорнае супраціўленне кітайскіх войск, японцы вымушаны былі адступіць, страціўшы забітымі 300 чалавек.

У размешчаныя на поўнач ад Кантона раёны японцы пасылаюць новыя падмацаванні.

СУСТРЭЧА КРЭЙГІ З АРЫТА

ТОКІО, 9 мая. (ТАСС). 8 мая англійскі пасол у Токіо Крэйгі наведаў міністра замежных спраў Японіі Арыта і меў з ім гутарку на працягу сарака мінут. У гутарцы Крэйгі абмяняўся з Арыта думкамі адносна становішча ў Еўропе. Крэйгі патрэбаваў падрабязнага аб'яснення адносна дзейнасці ўноў створанага японцамі федэральнага банка ў Шанхаі, а таксама зрабіў запытанне адносна паўторных бамбардыровак японскімі самалётамі англійскага консульства ў Чунцыне.

Замежная хроніка

Замежнае суднаходства ля берагоў Кітая амаль спынілася. За апошні час японцы захапілі там 25 замежных параходаў.

***

Карэспандэнту германскай газеты «Фелькішэр беабахтэр» у Каіры прапанавана пакінуць Егіпет.

***

Германскія ўлады прыступілі да высялення палякаў з пагранічных з Польшчай раёнаў углыб Германіі.

***

Польскімі ўладамі ў Быдгошчы (Познанскае ваяводства) па меркаваннях грамадскай бязапаснасці закрыт нямецкі тэатр.

ЭКСПЕДЫЦЫІ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

У сярэдзіне мая ў Палескую вобласць выязджае экспедыцыя геалагічнага інстытута Акадэміі навук БССР. Экспедыцыя, якая складаецца з геолагаў і інжынераў-разведчыкаў, будзе праводзіць геалагічныя доследы і пошукі карысных выкапняў у 7 раёнах Палесся — Капаткевіцкім, Ельскім і інш., з ахопам плошчы ў 4 тысячы кв. кілометраў. Геолагі прабудуць на Палессі каля 5 месяцаў.

Інстытут торфу Акадэміі навук БССР у гэтым-жа месяцы накіроўвае 4 экспедыцыйныя атрады на заводы «Свабода», «Татарка», «Дукоры» і інш. для вывучэння ў вытворчых умовах пытанняў механізацыі працэсаў здабычы торфу. У прыватнасці, ставіцца задача — распрацаваць тэхналогію здабычы, сушкі і хавання тарфяной сыравіны, прыгоднай для гідроліза.

ПРЭМІРАВАННЕ ЛЕПШЫХ НАСЦЕНГАЗЕТ ВНУ

Рэспубліканскі камітэт саюза работнікаў вышэйшай школы і навуковых устаноў БССР правёў днямі цікавае і патрэбнае мерапрыемства. У Доме вучоных (г. Менск) саюзам была арганізавана выстаўка насценгазет навукова-даследчых інстытутаў, вышэйшых навучальных устаноў і вопытных станцый.

9 мая быў арганізаван прагляд насценгазет работнікамі нізавога друку вышэйшай школы і навуковых устаноў з мэтай пераняцця лепшага вопыту выдання насценгазет. Была праведзена таксама гутарка для рэдактараў насценгазет на тэму «Якой павінна быць насценгазета вышэйшай школы».

Пасля саюз прэміраваў лепшыя насценгазеты. Першую прэмію атрымала насценгазета гомельскага лесатэхнічнага інстытута. Прэміраваны таксама насценгазеты ўпраўлення справамі Акадэміі навук, інстытута балотнай гаспадаркі, менскага сельскагаспадарчага тэхнікума, санітарна-хімічнага інстытута, плодагародняй станцыі і мопраўская газета Акадэміі навук.

Мерапрыемства, праведзенае саюзам работнікаў вышэйшай школы і навуковых устаноў, заслугоўвае ўвагі і пераймання.

ТРОХТОМНІК ВЫБРАНЫХ ТВОРАЎ ЯКУБА КОЛАСА

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдае трохтомнік выбраных твораў народнага паэта рэспублікі ордэнаносца Якуба Коласа. Першы том ужо выйшаў. Днямі выходзіць з друку трэці том, у які ўвайшлі аповесць «Дрыгва», апавяданні «На прасторах жыцця», «Арынчына перамога» і іншыя творы. Кнігі прыгожа афармлены.

ПРАЦАУСТРОИСТВА ПЕРАРОСТКАЎ ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ

1.650 пераросткаў дзіцячых дамоў БССР будуць устроены ў гэтым годзе на работу на фабрыках і заводах, у соўгасах, МТС, на транспарце, у гандлёвых прадпрыемствах, у сістэме спажывецкай кааперацыі і т. д.

Соўнарком БССР абавязаў дырэктараў прадпрыемстваў стварыць неабходныя ўмовы для работы і вучобы пераросткаў. Кіраўнікі адпаведных наркаматаў, прадпрыемстваў і ўстаноў папярэджаны, што яны нясуць персанальную адказнасць за стварэнне добрых бытавых умоў былым выхаванцам дзіцячых дамоў, а таксама за іх вучобу і выхаванне.

ФАБРЫЧНЫ СТАДЫЁН

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). У раёне шаўковай фабрыкі днямі адкрыўся новы вялікі стадыён. Усе работы па яго абсталяванню выкананы фізкультурнікамі спартыўнага таварыства «Азот». На стадыёне ёсць футбольнае поле, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі, бегавая дарожка, поле для здачы норм на значок ГПА, танцавальная пляцоўка.



У торфарцелі «Ударнік», Менскага раёна. НА ЗДЫМКУ: калгасніца Е. Ф. Бельская, адна з вылучаных сельгасарцеллю імені Леніна, Кайкаўскага сельсавета, для работы ў торфарцелі, — аа рассцілае торфу. Фото І. С. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

НЕАБХОДНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

Веласіпед увайшоў у быт працоўных. Сотні і тысячы рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі нашай краіны маюць уласныя веламашыны. Гэта вельмі зручны від перасоўвання. Веласіпед таксама мае вялікае спартыўнае значэнне.

Але бяда ў тым, што ні ў адным горадзе або раённым цэнтры няма спецыяльна прыстасаваных памяшканняў, дзе-б той ці іншы грамадзянін мог часова, за пэўную плату, здаць на хаванне веламашыну.

Так, таварыш прыязджае на веласіпедзе ў горад. Трэба зайсці ва ўстановы, магазіны, пабываць у кіно, тэатры, а пакінуць машыну няма дзе, яе прыходзіцца цягаць увесь час з сабой. Зразумела, гэта вельмі нязручна.

Наспела пытанне арганізацыі ў гарадах спецыяльных памяшканняў — камер для часовага хавання веласіпедаў.

В. С. ГАЛУБОВІЧ.

СПАБОРНІЦТВЫ АУТАМАБІЛІСТАЎ І МАТАЦЫКЛІСТАЎ

12 мая на 2-м кілометры Магілеўскага шасе адбудуцца першыя ў гэтым летнім сезоне спаборніцтвы 50 лепшых аўтамабілістаў і матацыклістаў — спартсменаў Менска. У праграме — гонкі на дыстанцыю 1 кілометр з месца і з ходу для аўта і мота, а таксама пасейныя гонкі з кіданнем гранаты ў цэль на ходу следвання машын. Пры гэтым палавіну шляху ўдзельнікі спаборніцтваў пройдуць у пропівагазах.

ГЕНЕРАЛЬНЫ ПРАЕКТ ПЛАНІРОЎКІ БАРЫСАВА

Украінскі дзяржаўны інстытут праектыравання гарадоў па даручэнню Наркамата комунальнай гаспадаркі БССР распрацаваў генеральны праект планіроўкі гор. Барысава. Горад карэнным чынам зменіць свой твар і стане адным з культурнейшых упрыгожаных гарадоў рэспублікі. Яго прамысловасць атрымае далейшае развіццё. Запраектыравана будаўніцтва фабрыкі цацак, завода будаўнічых дэталей, суднарамонтнай верфі, мясакамбіната, піваваранага завода, завода па рамонту абсталявання.

Горад узбагаціцца новымі прыгожа афармленымі будынкамі—Домам советаў, тэатрам, кіно, Палацам культуры, Домам моладзі, музеем, бібліятэчным будынкам, новымі каменнымі жылымі дамамі.

Вуліцы Чапаева, III Інтэрнацыянала, Полацкая, Таварная будуць расшыраны да 25—40 метраў, а бульварныя вуліцы—да 50 метраў з пакрыццём удасканаленымі маставымі—асфальтам, клінкерам. Узнікне рад новых плошчаў.

У пойме ракі Бярэзіны намячаецца стварэнне цэнтральнага парка культуры і адпачынку. У паўночнай частцы горада будзе створан загарадны парк культуры.

У сучасны момант горад атрымлівае электраэнергію ад ЦЭЦ запалкавай фабрыкі імені Кірава. Прадугледжваецца пабудова новай ЦЭЦ, якая будзе забяспечваць горад цяплом і электраэнергіяй. Намячаецца пабудова пэнтральнага гарадскога водаправода з паступовым павелічэннем падачы вады да 175 літраў ў суткі на кожнага жыхара. Распрацавана схема каналізацыі.

Асноўным відам унутрыгарадскога транспарта будзе аўтобус. Апрача таго, у перыяд навігацыі на Бярэзіне будзе арганізаван рачны трамвай.

Ажыццяўленне праекта разлічана на 15—20 год. Праект разглядаўся і адобран на пленуме Барысаўскага гарадскога совета, а таксама ў навукова-тэхнічным совеце Наркамата комунальнай гаспадаркі БССР.

АД РЭДАКЦЫІ

15 жніўня 1937 года ў нашай газеце быў змешчан артыкул «Дзіўныя паводзіны парткома Наркамасветы», у якім выкрываліся варожыя справы некаторых прапаваўшых тады ў НКА асоб.

У гэтым-жа артыкуле абвінавачвалася і т. Мышленік В. І. у грубых адносінах да настаўнікаў і спачуванні варожым элементам. Паўторная праверкай гэта абвінавачанне т. Мышленік не пацвердзілася.

Гэтым рэдакцыя выпраўляе сваю памылку.

ДЗЕННІК

Сёння, у 7 гадзін вечара, у Доме партактыва адбудзецца агульнагарадская нарада старшынь ЦП профсаюзаў, фабзаўмясцкомаў, культработнікаў профсаюзаў і арцелей промкааперацыі, загадчыкаў клубаў і кіраўнікоў культурна-асветных устаноў гор. Менска.

МЕНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

Сёння, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва адбудзецца лекцыя **аб міжнародным становішчы.**

Дакладчык — сакратар Менскага абкома КП(б)Б тав. Хаін-Юмскі.

Білеты — у РК КП(б)Б.

СТАЛІНСКІ РК КП(б)Б.

Сёння, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома тэхнікі адбудзецца групавая кансультацыя для агітатараў і бяседчыкаў Кагановіцкага раёна на тэму «Міжнароднае становішча Совецкага Саюза».

Кансультант тав. Раманенка.

Уваход свабодны.

Сёння, у 7 гадзін вечара, у пакоі № 18 Дома партактыва адбудзецца кансультацыя па II раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» на тэму «Стварэнне Расійскай Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі. З'яўленне ўнутры партыі фракцый большэвікоў і меншавікоў».

Сёння, у 7 гадзін вечара, у актавай зале Курсаў партактыва ЦК КП(б)Б (вул. Карла Маркса, 31) адбудзецца гарадскі сход фізкультурнага актыва. У парадку дня: Даклад аб выніках XVIII з'езда ВКП(б).

Дакладчык — дэлегат з'езда тав. Галоўкін.

Білеты — у гарадскім камітэце фізкультуры і спорта.

АД ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПА БССР

Парткалегія КПК па БССР просіць тав. Раматоўскага Сігізмунда Эдуардавіча паведаміць свой адрас і месца работы.

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

Гастролі Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР

(Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра)

11 мая

А. Арбузоў.

ТАНЯ

Пачатак у 8 г. веч.

ВЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

11 мая

БАХЧЫСАРАЙСКІ ФАНТАН

Абанемент № 80.

Пачатак у 8 г. веч.

ВЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР

Апошнія два спектаклі

11 мая

Абанемент № 147.

Прэмера

Э. Самуйлёнак.

ПАГІБЕЛЬ ВОЎКА

Пачатак у 7 г. 30 м. веч.

Кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»

КАРМЕЛЮК

Кінотэатр «РОДИНА»

ПІЧОРС

Пачатак у 6, 8.20, 10.40.

ЛЕТА 1939 г. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР

ГАСТРОЛІ ТЭАТРАЎ РСФСР і УССР

Ленінградскі дзяржаўны тэатр пад кіраўніцтвам засл. арт. респ. ордэнаносца С. Э. РАДЛОВА (у памяшк. Дзярж. Яўрэйскага тэатра)

РЭПЕРТУАР:

Шэкспір — ГАМЛЕТ
Фін і Гус — КЛЮЧЫ БЕРЛІНА
Ібсен — «ПРИВИДЕНИЯ»
Салаўёў — ЧУЖЫ
Н. Остроўскі — ЯК ГАРТАВАЛАСЯ СТАЛЬ
Гальдоні — СЛУГА ДВУХ ГАСПАДАРОЎ.

Украінскі тэатр ім. Ів. Франка (Кіеў) (у памяшк. Вялікага тэатра оперы і балета)

РЭПЕРТУАР:

Карнейчук — БАГДАН ХМЕЛЬНІЦКІ.
Катаеў — ШОЎ САЛДАТ З ФРОНТА
Карнейчук — ПРАЎДА
С. Галаванёўскі — ДОЛЯ ПАЭТА
Старыцкі — ОЙ, НЕ ХОДЫ, ГРЫЦЮ...
Гогаль — РЭВІЗОР.

ПРЫЁМ КАЛЕКТЫЎНЫХ ЗАЯВАК І ПРОДАЖ ПАСТАЯННЫХ МЕСЦ. ДАВЕДКІ ПА ТЭЛ. № 24-289.

Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»

НЕУСТРАШЫМЫЯ

Кінотэатр «СПАРТАК»

ВОЛГА, ВОЛГА

ДЗІЦЯЧЫ КІНОТЭАТР

МАРСКІ ПОСТ

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»

1. МАСКВА—ЗІПА (беспасадачны пералёт Героя Совецкага Саюза В. К. Кокінакі).
2. Журналы Маскоўскай студыі кінохронікі №№ 38, 39 і 40.

Памяшканне Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР (Тэл. 24-122)

З 17 мая ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ТЭАТРА

МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР

РЭПЕРТУАР:

Муз. В. Александрава — «СВАДЬБА В МАЛИНОВКЕ»
Муз. Заграніччнага — «ГОЛУБЫЕ СКАЛЫ»
Муз. ордэнаносца Дунаеўскага І. О — «ЗОЛОТАЯ ДОЛИНА»
Муз. Блантэра і Александрава — «НА БЕРЕГАХ АМУРА»
Муз. і тэкст нар. арт. СССР ордэнаносца Гаджыбекава — «АРШИН МАЛ-АЛАН»
Муз. Стоттард і Фрымль — «РОЗ-МАРИ»
Муз. Якобі — «ЯРМАРКА НЕВЕСТ»

Папярэдні продаж пастаянных месц і прыём заявак на культпаходы і мэтавыя спектаклі праводзіцца штодзённа ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 9 г. веч

ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ «СОЮЗОРГУЧОТ»

ПРАВОДЗІЦЬ НАБОР КУРСАНТАЎ

на 6-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы ІНСТРУКТАРАЎ-БУХГАЛТАРАЎ ПА КАЛГАСНАМУ ЎЧОТУ ДЛЯ РАЙЗА І МТС.

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж рахункавай работы па падвойнай сістэме не ніжэй 2-х год і асвету не ніжэй 7-мі класаў.

Стыпендыя 125—175 руб. у месяц (у залежнасці ад паспяховасці) і 40 руб кватэрных.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы: пасведчанне аб адукацыі, метрычны выпіс, даведкі аб стане здароўя, аб працоўным стажы ў галіне рахункаводства і аб вызваленні з апошняга месца работы, аўтабіяграфію, дзве фотакарткі, а таксама паштовых марак на 60 кап. для адказу.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ПРАДОЎЖАН ДА 25 МАЯ.

Іспыты праводзяцца па беларускай мове, матэматыцы, палітграмаце і ўчоту. Яўка на іспыты — па выкліку камбіната.

Праезд на іспыты камбінатам не аплачваецца.

Даведкі можна атрымаць з 11 да 2 гадзін дня.

Заявы з дакументамі пасылаць па адрасу: г. Менск, Рэволюцыйная, 3. Навучальнаму камбінату «Союзоргучот».

ДЫРЭКЦЫЯ.

АРШАНСКАМУ АДДЗЯЛЕННЮ ДЗЯРЖБАНКА

патрэбны

кваліфікаваныя банкаўскія работнікі:

ПЛАНАВІКІ І НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА БУХГАЛТАРА.

Намесніку галоўнага бухгалтара прадастаўляецца абсталяваная кватэра.

Звяртацца па адрасу: гор. Орша, Дзяржбанк да кіраўніка.

ДЗЯРЖЦЫРК (парк ім. Горкага, тэл. 22-725).

АНОНС! АНОНС!

У бліжэйшыя дні

адкрыццё летняга сезона

У праграме — усе віды цыркавога мастацтва.

Прымаюцца заяўкі на пастаянныя месцы і мэтавыя прадстаўленні.

Даведкі можна атрымаць у канторы цырка штодзённа з 10 г. раніцы да 8 г. вечара. Тэлефон № 22-725

Аб дні адкрыцця будзе абвешчана асобна.

Сачыце за рэкламай.

ДЗЯРЖАЎНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

17 і 18 мая

ПРЭМ'ЕРА

РУСАЛКА

(на рускай мове)

17 мая — абанемент № 71; 18 мая абанемент № 72.

Білеты, купленыя на спектакль «Русалка» 5 мая, сапраўдны на 17 мая; білеты, купленыя на спектакль «Русалка» 6 мая, сапраўдны на 18 мая.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Усесаюзнае гастрольна-канцэртнае аб'яднанне ДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ

(памяшк. клуба ім. Сталіна)

11 мая Абанементы №№ 44 і 45.

КАНЦЭРТ

МАЙСТРАЎ МАСТАЦТВАЎ

Засл. артыстка РСФСР, праф. Маскоўскай дзяржкансерваторыі, ордэнаносец К. А. ЭРДЭЛІ (арфа).

Салістка Маскоўскай дзяржфілармоніі Е. А. АНДРЭЕВА-РАБАВА (меццо-сапрана)

Аспірант Маскоўскай дзяржкансерваторыі Б. ДАБРАХОТАЎ (віяланчэль)

Артыстка Ўсесаюзн. гастр.канцэртнага аб'яднання Л. ПАЛОНСКАЯ (партыя фортэпіяна)

Пачатак у 9 г. веч.

Білеты ў касе клуба з 3 да 9 г. веч і ў магазіне сангігіены і оптыкі (рог Совецкай і Ленінскай) з 3 да 11 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР

(Памяшк. клуба ім. Сталіна)

13 мая абанементы №№ 46 і 47

КАНЦЭРТ

Лаўрэат Міжнароднага конкурса ім. Ізаі ў Бруселі

Марына КАЗАЛУПАВА (скрыпка)

Лаўрэат Усесаюзнага конкурса музыкантаў-выканаўцаў

Галіна КАЗАЛУПАВА (віяланчэль)

Ірына КАЗАЛУПАВА (партыя фортэпіяна)

Пачатак у 9 г. вечара.

Білеты прадаюцца ў касе клуба з 3 да 9 г. веч. і ў магазіне сангігіены і оптыкі (рог Совецкай і Ленінскай вул.) з 3 да 11 г. вечара.

ЗАПОМНІЦЕ! УСЕ КНІЖНЫЯ МАГАЗІНЫ КОГІЗА І КІЕСКІ Ў ШКОЛАХ КУПЛЯЮЦЬ І ПРАДАЮЦЬ ПАТРЫМАНЫЯ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

ПРАДАВАЙЦЕ ПАТРЫМАНЫЯ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

31 МАЯ

АПОШНІ ДЗЕНЬ АТРЫМАННЯ падпісчыкамі неатрыманых АБЛІГАЦЫЙ „Пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР“.

Грамадзяне, якія падпісаліся на «Пазыку ўмацавання абароны Саюза ССР» і не атрымалі аблігацый, могуць атрымаць іх у цэнтральных або раённых ашчадных касах па месцу падпіскі ТОЛЬКІ ДА 1 ЧЭРВЕНЯ 1939 г.; пасля гэтага тэрміна падпісчыкі трацяць права на атрыманне аблігацый.

Для атрымання аблігацый з ашчадных кас рабочыя і служачыя павінны прадставіць даведку ад бухгалтэрыі прадпрыемства, або ўстановы аб суме выплачаных узносаў па падпісцы, а калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі—застаўшуюся ў іх на руках разліковую квітанцыю па пазыцы.

УПРАЎЛЕННЕ АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 7

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА АД 26 КРАСАВІКА 1939 ГОДА

„АБ БАРАЦЬБЕ З ШАЛЕНСТВАМ САБАК“

Менскі гарадскі совет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усіх уласнікаў сабак:

а) да 15 мая 1939 г. зарэгістраваць сабак у інспекцыі дабрабыту Менкомгаса і атрымаць аб рэгістрацыі нумар;

б) вартавых сабак трымаць на кароткім ланцугу;

в) выпускаць сабак на вуліцу, лесніцы і іншыя месцы грамадскага карыстання толькі ў наморднiках або выводзіць іх на кароткай прывязі;

г) пры падазронасці ў захварэнні шаленствам сабак безадкладна паведамляць у ветінспектуру або міліцыю. Да агляду ветурачом ізаліраваць хворых сабак.

2. Сабакі, якія паяўляюцца на вуліцах без устаноўленых нумароў і наморднікаў, лічацца брадзячымі і падлягаюць лоўлі і ізаліруюцца не раней, чым на 3 дні. Сабакі, ізаліраваныя на ўказаны тэрмін, не апазнаныя іх уласнікамі, знішчаюцца.

3. Лоўля брадзячых сабак можа ўтварацца да 9 гадзін раніцы на вуліцах, бульварах, скверах, плошчах і іншых месцах грамадскага карыстання, а па заявах домаўпраўленняў, органаў міліцыі, ветнагляду — і ва дварах домаўладанняў.

4. Лоўлю і ізаляцыю брадзячых сабак ускласці на ўпраўленне ачысткі.

5. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РО міліцыю і ветінспектуру.

6. Вінаўныя ў нарушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці — штрафу да 100 руб. або прымусовых работ да 15 дзён.

7. Гэтая пастанова ўваходзіць у сілу праз 5 дзён пасля яе апублікавання.

В. а. старшыні Менскага гарадскога совета З. ГЕРЧЫКАЎ.
В. а. сакратара Менскага гарадскога совета Ф. ДЗЯМІДАЎ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 21-846. Аддзелаў: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 20-830; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23 955; мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189; пісем — 20-844, 21-399, 21 885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556; заг. выдавецтвам — 21-358; аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—1046. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш.